Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 ЛІСТАПАДА 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 211 (26324)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Перамога Вялікага Кастрычніка адкрыла новую старонку ў сусветнай гісторыі. Абвясціўшы прынцып права нацый на самавызначэнне, яна стварыла небывалыя раней магчымасці для нацыянальнага адраджэння, паскоранага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця народаў.

Менавіта дзякуючы ўстанаўленню савецкай улады беларусы ўпершыню набылі сваю дзяржаўнасць — Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку.

Нашы прадзеды і дзяды шчыра верылі ў ідэалы рэвалюцыі — раўнапраўе і сацыяльную справядлівасць. У вельмі складаных умовах яны будавалі братэрскі саюз народаў СССР. Не шкадавалі жыцця ў барацьбе з іншаземнымі захопнікамі. Дабіваліся значных поспехаў у мірны час, ствараючы магутны навукова-вытворчы патэнцыял, асвойваючы космас, выкарыстоўваючы ў імя прагрэсу прыродныя рэсурсы.

Аддаючы даніну павагі гістарычным падзеям, сёння наша краіна ўпэўнена рухаецца наперад. Дынамічна развіваецца эканоміка, паляпшаецца жыццё людзей, умацоўваюцца абараназдольнасць дзяржавы і сацыяльна-палітычная стабільнасць грамадства, расце міжнародны аўтарытэт Беларусі. Усё гэта вынік правільнага стратэгічнага курсу, які падтрыманы беларускім народам і паслядоўна рэалізуецца ў складаных сучасных умовах.

Ад усёй душы жадаю вам, дарагія суайчыннікі, аптымізму, здароўя, шчасця, новых дасягненняў і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 22

АБ ГАРАНТЫЯХ ЗАХАВАНАСЦІ ГРАШОВЫХ СРОДКАЎ ФІЗІЧНЫХ АСОБАЎ, РАЗМЕШЧАНЫХ НА РАХУНКАХ І (АБО) У БАНКАЎСКІЯ ЎКЛАДЫ (ДЭПАЗІТЫ)

У мэтах забеспячэння захаванасці грашовых сродкаў фізічных асобаў, размешчаных на рахунках і (або) ва ўклады (дэпазіты) у банках Рэспублікі Беларусь, і ў адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 101 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь:

1. Устанавіць, што:

1.1. дзяржава гарантуе поўную захаванасць грашовых сродкаў фізічных асобаў у беларускіх рублях і замежнай валюце, размешчаных на рахунках і (або) ва ўклады (дэпазіты) у банках Рэспублікі Беларусь, і кампенсацыю 100 працэнтаў сумы гэтых сродкаў у валюце рахунку або ўкладу (дэпазіту) у выпадку прыняцця Нацыянальным банкам рашэння аб адкліканні ў банка спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці, які дае права на правядзенне банкаўскай аперацыі па прыцягненні грашовых сродкаў фізічных асобаў у банкаўскія ўклады (дэпазіты), у цэлым або ў частцы правядзення такой банкаўскай аперацыі;

1.2. дзеянне гэтага Дэкрэта не распаўсюджваецца на грашовыя сродкі ў беларускіх рублях і замежнай валюце, размешчаныя на рахунках і (або) ва ўклады (дэпазіты) у банках Рэспублікі Беларусь фізічнымі асобамі, якія выступаюць у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў;

1.3. кампенсацыя грашовых сродкаў фізічных асобаў у беларускіх рублях і замежнай валюце, размешчаных на рахунках і (або) ва ўклады (дэпазіты) у банках Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам;

1.4. грашовыя сродкі, размешчаныя фізічнымі асобамі на рахунку і (або) ва ўклады (дэпазіты) у банках Рэспублікі Беларусь, іх выдача, а таксама перавод з рахунка ў (укладаў) у банках іншых дзяржаў у банкі Рэспублікі Беларусь не падлягаюць дэкларыванню;

1.5. з 2010 года 80 працэнтаў прыбытку Нацыянальнага банка, вызначанага на падставе яго гадавога бухгалтарскага балансу, прыняўшы наяўнасці аўдытарскага заключэння, якое пацвярджае сапраўднасць бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці Нацыянальнага банка, штогод накіроўваецца ў рэзерв дзяржаўнай установы «Агенцтва па гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў» (далей — Агенцтва), а астатняя частка выкарыстоўваецца на павелічэнне (стварэнне) статутнага, рэзервовага і іншых фондаў Нацыянальнага банка;

1.6. абавязковыя ўзносы, якія пералічаюцца банкамі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі ў рэзерв Агенцтва ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 года «Аб гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 172, 2/1466), адносяцца да затрат банкаў па вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, тавараў (работ, паслуг), што ўлічваюцца пры падаткаабкладанні прыбытку банкаў;

1.7. памер каляндарных узносаў у рэзерв Агенцтва для адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»:

з 1 студзеня 2009 г. па 31 снежня 2011 г. складае ў I квартале 2009 г. 0,037 працэнта ад сумы размешчаных фізічнымі асобамі на рахунках і (або) ва ўклады (дэпазіты) грашовых сродкаў на першае чысло месяца, які ідзе за справаздачным кварталам, і ў кожным наступным квартале названага перыяду павялічваецца на 0,022 працэнта ад памеру папярэдняга каляндарнага ўзносу;

з 1 студзеня 2012 г. вызначаецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў».

1.8. пры дзяржаўнай рэгістрацыі Агенцтва дзяржаўная пошліна не спаганяецца;

1.9. Агенцтва мае права мець пячатку, штамп і бланкі з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь;

1.10. афіцыйнымі выданнямі для апублікавання гадавой справаздачы Агенцтва і іншай інфармацыі, прадугледжанай Законам Рэспублікі Беларусь «Аб гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў», з'яўляюцца рэспубліканскія друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, вызначаныя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь афіцыйнымі выданнямі для апублікавання нарматыўных прававых актаў Нацыянальнага банка.

2. Прызнаць страціўшымі сілу:

Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 красавіка 1998 г. № 4 «Аб гарантыях захаванасці сродкаў фізічных асобаў у замежнай валюце, што знаходзяцца на рахунках і ва ўкладах (дэпазітах) у банках Рэспублікі Беларусь» (Збор дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта і пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 12, арт. 310);

Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 лютага 2003 г. № 8 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 красавіка 1998 г. № 4» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 20, 1/4395);

Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 2005 г. № 13 «Аб унясенні змянення ў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 красавіка 1998 г. № 4» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 156, 1/6839).

3. Нацыянальнаму банку ўнесці грашовы ўзнос у суме 100 млрд рублёў для фарміравання маёмасці Агенцтва.

4. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

4.1. у 2008 годзе ва ўстаноўленым парадку забяспечыць унясенне са сродкаў рэспубліканскага бюджэту грашовага ўзносу ў суме 100 млрд рублёў для фарміравання маёмасці Агенцтва;

4.2. пры падрыхтоўцы праекта нарматыўнага прававога акта аб удакладненні паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на 2008 год улічыць сродкі, названыя ў падпункце 4.1 гэтага пункта.

5. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнаму банку да 1 студзеня 2009 г. забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Дэкрэтам і прыняць іншыя меры па яго рэалізацыі.

6. Да прывядзення заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Дэкрэтам акты заканадаўства прымяняюцца ў той частцы, у якой яны не супярэчаць гэтаму Дэкрэту.

7. Гэты Дэкрэт уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання, з'яўляецца часовым і ў адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 101 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прадстаўляецца на разгляд Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

4 лістапада 2008 г.
г. Мінск.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Эксперт «Звязды»

Міхаіл КАВАЛЁЎ: «У БЕЛАРУСІ СТВАРАЮЦЦА ЎНІКАЛЬНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ЎКЛАДЧЫКАЎ»...

Падпісаны Прэзідэнтам Беларусі дэкрэт, якім прадастаўляюцца поўныя гарантыі дзяржавы на вяртанне банкаўскіх укладаў фізічных асобаў незалежна ад відаў валют, тэрмінаў і формы ўласнасці банкаў, з'явіўся своечасова, лічыць член грамадскага навукова-эканамічнага савета пры «Звяздзе», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ. Як заўважыў эксперт, у дакументе дакладна прапісана, хто і за кошт якіх сродкаў будзе гарантаваць уклады насельніцтва, прычым стапрацэнтна.

— Ствараецца агенцтва па гарантаванні ўкладаў, прапісаны крыніцы сродкаў для гэтага агенцтва, што, безумоўна, вельмі выгадна для ўкладчыкаў, — гаворыць прафесар. — Цяпер кожны ўкладчык ведае, што ўклады няма патрэбы драбіць па некалькіх банках, паколькі раней гарантавалася толькі 1 тысяча еўра, ці ў далейшым меркавалася павысіць гарантыі да 5 тысяч еўра. Цяпер кожны смела можа несці ўсе свае сродкі ў адзін банк. Нават у тым выпадку, калі іх будзе больш за 70 мільёнаў рублёў: дэкларавацъ, адкуль ва ўкладчыка такія грошы, ужо не трэба, і дзяржава пры дапамозе агенцтва па гарантыях, што ствараецца, у выпадку банкруцтва банка адразу ж верне гэтыя грошы. Прычым фонд агенцтва, якое будзе створана, дастаткова значны. Але, на мой погляд, гэты фонд і не спатрэбіцца, таму што адначасова дэкрэт звужае колькасць банкаў, якім праз год будзе дазволена прыцягваць укклады насельніцтва. Банкі, якія плануюць працаваць з дэпазітамі фізічных асобаў, павінны будуць мець уласны капітал 25 мільёнаў еўра. 25 мільёнаў еўра — гэта вельмі значная сума, і яна сама па сабе будзе гарантам стабільнасці банка.

— Міхаіл Міхайлавіч, трэба разумець, у краіне ствараюцца сапраўды ўнікальныя ўмовы для ўкладчыкаў?

— Стапрацэнтная гарантыя, адсутнасць дэкларавання, магчымасць датэрміновага зняцця ўклада і, нарэшце, незбіранне падаходнага падатку з працэнтных даходаў, сапраўды, ствараюць у Беларусі ўнікальныя ўмовы для ўкладчыкаў. Калі быць шчырым, гэтыя ўмовы не вельмі выгадныя для банкаў. І я мяркую, што даючы стапрацэнтную гарантыю вяртання ўкладаў, можна было б адмяніць права датэрміновага зняцця грошай. Такога няма ні ў адной краіне свету: там, калі вы паклалі грошы на 6 месяцаў у банк, зняць іх можна толькі праз 6 месяцаў, а не датэрмінова. У Беларусі ж, калі мне не спадабаўся банк, альбо спатрэбіліся грошы, банк абавязаны датэрмінова вярнуць уклад, праўда, ён мае права ў меншым аб'ёме выплаціць працэнты. Гэта вельмі цяжкія ўмовы для банкаў.

— Як вы мяркуеце, прывабныя ўмовы захоўвання зберажэнняў у беларускіх банках пашыраць геаграфію ўкладчыкаў: у банкаў шмат з'явіцца кліентаў з-за межаў краіны?

— Я не думаю, што шмат замежных укладчыкаў адразу ж пянсуць свае грошы ў беларускія банкі. Але ўпэўнены, што наша насельніцтва яшчэ больш спакойна будзе давяраць свае сродкі беларускім банкам. Хоць, не выключаю, што ва ўмовах, калі назіраецца нестабільнасць ва Украіне, у невялікіх расійскіх банках, з пагранічных рэгіёнаў людзі могуць прынесці зберажэнні ў беларускія банкі. Да таго ж у свеце заўсёды знаходзяцца экзатычныя фігуры, якія могуць, напрыклад, з Канады перавесці грошы на дэпазіт у наш банк.

Адзінае, што я яшчэ зрабіў бы, — паклапаціўся б не толькі аб захаванасці ўкладаў насельніцтва, але і аб тым, каб грошы, якія людзі прынясуць у банкі, эфектыўна выкарыстоўваліся. Каб яны не пашыралі імпарт у краіну і не ствралі праблемы беларускім прадпрыемствам. Таму я не выключаю, што было б мэтазгодна абмежаваць долю сродкаў насельніцтва ў банках, якія накіроўваюцца на спажывецкае крэдытаванне. Таму што сёння склалася сітуацыя, што з 13,3 трыльёна рублёў, прынесеных у банкі, 11 з лішкам аддадзены насельніцтву на крэдыты. Добра, што палова з іх пайшла на будаўніцтва жылля (крэдытаванне будаўніцтва жылля ніяк нельга абмяжоўваць, наадварот, патрэбна яго стымуляваць), а вось выдачу крэдытаў на куплю імпартных аўтамабіляў, тэлевізараў, халадзільнікаў я, магчыма, і абмежаваў бы. Як звычайны ўкладчык я хацеў бы, каб на мае грошы стварылі, напрыклад, новую мадэль трактара, а не набываў хтосьці патрыманы аўтамабіль. Для эканомікі гэта дрэнна. Таму было б правільна, калі б у цяперашніх умовах банк мог накіраваць на спажывецкае крэдытаванне толькі пэўны працэнт прыцягнутых грошай ад насельніцтва.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Прамая лінія

МЫ І НАШЫ ДЗЕЦІ

У вас цяжкасці ва ўзаемаадносінах са сваім дзіцем? Вы заўважаеце, што апошнім часам ваш сын ці дачка сталі вельмі раздражнёнымі, а прычыну гэтага не можаце зразумець. Як быць? Як ўгуле захаваць псіхічнае здароўе падрастаючага пакалення і як засцерагчы нашых дзяцей ад непатрэбных комплексаў і шкодных звычак? Аб усім гэтым можна будзе пагаварыць на «прамой лініі» з **галоўным пазаштатным спецыялістам па дзіцячай псіхіятрыі, асістэнтам кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі БДМУ кандыдатам медыцынскіх навук Інай Віктараўнай ПЯТНІЦКАЙ.**

«Прамая лінія» адбудзецца **13 лістапада, у чацвер, з 16.00 да 17.00 па тэлефонах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У БЕЛАРУСІ ПАЧАЛАСЯ ВЫПЛАТА ПЕНСІЙ ЗА 7 ЛІСТАПАДА

У сувязі са святкаваннем Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі графік выплаты пенсій у Беларусі падкарэктаваны, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела плацяжоў РУП «Белпошта» Таццяна Цітавец.

Паколькі 7 лістапада аддзяленні сувязі не працуюць, выплата пенсій за гэты дзень ажыццяўляецца на адзін-два дні раней — 5 і 6 лістапада. Фінансаванне пенсій праведзена загадзя і ў неабходным аб'ёме. Спецыяліст удакладніла, што 8 лістапада будуць выплачаны пенсіі за 8 і 9 лістапада.

БЕЛТА.

ЗЛОЎЖЫВАННЕ «ПАЦЯГНУЛА» НА 220 МЛН?..

Папярэднім расследаваннем Маскоўскага РУУС Мінска ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да адказнай асобы ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі істытут прафесійнай адукацыі».

Паводле папярэдняй інфармацыі, падазраецца 59-гадовы мужчына ў тым, што ў чэрвені 2006 года, злоўжываючы службовым становішчам, нанёс урон установе ў памеры 220 мільёнаў 900 тысяч рублёў.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

«ЗАКАЗАЛА» СУПЕРНІЦУ

У вёсцы Баянічы Любанскага раёна супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС і крымінальнага вышуку РАУС затрымалі 36-гадовую непрацуючую жыхарку вёскі Загалле.

Жанчына, якая раней была судзімая за крадзеж, на гэты раз пайшла на больш цяжкае злачынства — вырашыла пазбавіцца на глебе рэўнасці 37-гадовай жанчыны з іншай вёскі. А каб ажыццявіць задуманае, зрабіла «заказ» на забойства, як ёй уяўлялася, суперніцы. Ды толькі ў цёмную справу своечасова ўмяшаліся праваахоўнікі і папярэдзілі злачынства.

Ігар ГРЫШЫН.

ДЗЯЦЕЙ ЭВАКУЯВАЛІ СА ШКОЛЫ...

Дзевяць вучняў сярэдняй сталічнай школы былі шпіталізаваныя ў дзіцячыя бальніцы ў аўторак.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, раніцай невядомы ў памяшканні СШ № 172 па вуліцы Ахоцкай распыліў пярцовы газ з балончыка. У выніку гэтага хуліганства занятку былі сарваныя на тры гадзіны: з будынка тэрмінова эвакуявалі 400 вучняў і 50 настаўнікаў, а таксама абслуговы персанал. Па медыцынскую дапамогу ў дзіцячыя бальніцы звярнуліся 17 вучняў. Злачынства ўчыніў 16-гадовы падлетак, які раней ужо быў судзімы за крадзеж і пашкоджанне маёмасці. Ён затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Ігар ГРЫШЫН.

КАЛІ ТРАКТАР ЕДЗЕ САМ

На полі каля в. Быцень Івацэвіцкага раёна знайшлі мёртвага пенсіянера. Судмедэкспертыза ўстанавіла, што ў загінулага пераломаны косткі таза.

Як паказала расследаванне, стары, хутчэй за ўсё, падчас збору буракоў неасцярожна трапіў пад самаробны трактар, які самастойна рухаўся па полі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу:
220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 12 НОЯБРЯ 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 10 ноября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 12 ноября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – до 10 ноября 2008 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.

УНП 100325912

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» повысил с 6 ноября 2008 года процентную ставку по вновь выдаваемым сберегательным сертификатам на предъявителя в белорусских рублях до

15 % ГОДОВЫХ.

Сберегательные сертификаты ОАО «АСБ Беларусбанк»:

- Срок обращения сертификата – 3 месяца.
- Фиксированная процентная ставка в течение срока обращения сертификата.
- Сберегательные сертификаты оформляются на предъявителя.
- Погашение сертификатов осуществляется в любом отделении банка, независимо от места их приобретения.
- Покупка сертификата не требует предъявления паспорта.
- Сберегательный сертификат – оригинальный подарок близким и друзьям.

ОАО «АСБ Беларусбанк» напоминает гражданам, что продолжает прием денежных средств на новый срочный банковский вклад в белорусских рублях и иностранной валюте (долларах США, евро и российских рублях)

«ПРЕСТИЖ».

- Срок хранения вклада — 3 месяца.
- Фиксированная ставка
  - в белорусских рублях — 15 % годовых,
  - в иностранной валюте (долларах США, евро и российских рублях) — 10 % годовых.
- Ежемесячная капитализация дохода и возможность его выплаты.
- Минимальная сумма для открытия вклада в белорусских рублях — 100 000 рублей, в иностранной валюте — сумма не ограничена.
- Вклад вносится наличными денежными средствами либо безналичным перечислением в белорусских рублях, долларах США, евро или российских рублях.
- Вклад может быть открыт на имя другого лица.

Предлагаем воспользоваться и другими услугами, имеющимися в банке.

Дополнительную информацию по размещению денежных средств на банковские вклады можно получить в любом учреждении банка или на сайте банка

http://www.belarusbank.by

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей.

	январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2007 г.
Вклады до востребования	20,3	62,4	149,7	238,4	148,6	193,3	202,6	233,2	244,1	365,5	397,0	29 577,5	31 832,6
в том числе: в белорусских рублях	19,4	59,3	146,3	234,1	142,4	187,7	196,5	222,2	237,7	355,5	388,0	29 408,3	31 597,5
в иностранной валюте	0,9	3,1	3,4	4,3	6,2	5,6	6,1	11,0	6,4	10,0	9,0	169,2	235,1
Срочные депозиты	30 358,5	32 352,4	24 405,4	38 746,0	48 555,5	31 125,0	54 036,6	38 911,9	30 223,7	55 111,0	42 713,9	52 150,6	478 690,4
в том числе: в белорусских рублях	26 895,8	28 068,5	20 038,5	29 455,9	42 531,2	25 248,9	42 908,6	32 018,1	23 385,1	42 826,4	34 573,9	35 011,8	382 962,8
в иностранной валюте	3 462,7	4 283,9	4 366,9	9 290,1	6 024,3	5 876,1	11 128,0	6 893,8	6 838,6	12 284,6	8 140,0	17 138,8	95 727,6

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. Лицензия на профессиональную и биржевую деятельность по ценным бумагам № 02200/0385515 (зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь 02.06.2008 № 193). УНП 100325912.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 599

АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ СТРАХАВЫХ ТАРЫФАЎ ПА АБАВЯЗКОВЫМ СТРАХАВАННІ АД НЯШЧАСНЫХ ВЫПАДКАЎ НА ВЫТВОРЧАСЦІ І ПРАФЕСІЙНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ

1. Зацвердзіць прыкладзеныя страхавыя тарыфы па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў на 2009 год.

2. У Правілах устанаўлення надбавак да страхавых тарыфаў па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў і скідак з гэтых тарыфаў, зацверджаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 531 «Аб устанаўленні памераў страхавых тарыфаў, страхавых узносаў, лімітаў адказнасці па асобных відах абавязковага страхавання» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 143, 1/7867):

2.1. у пунктах 4 і 6 словы «галіны (падгаліны) эканомікі» замяніць словамі «віду дзейнасці»;

2.2. у пункце 7 словы «галінам (падгалінам) эканомікі, адпаведным агульнасаюзнаму класіфікатару «Галіны народнай гаспадаркі» замяніць словамі «відам дзейнасці, адпаведным Агульнадзяржаўнаму класіфікатару відаў эканамічнай дзейнасці».

3. Гэты Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2009 г.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

4 лістапада 2008 г. г. Мінск.

На Камітэт дзяржкантролю Беларусі ўскладзена абавязковае ўзгадненне законапраектаў у фінансава-эканамічнай сферы

На Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі ўскладзена абавязковае ўзгадненне праектаў законаў у фінансава-эканамічнай сферы. Гэта прадугледжана ўказам № 600 «Аб унясенні змяненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і прызнанні страціўшымі сілу некаторых указаў і асобных палажэнняў указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях нарматворчай дзейнасці», які 4 лістапада падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Да гэтага часу такое ўзгадненне было прадугледжана толькі ў адносінах да праектаў прававых актаў Прэзідэнта Беларусі ў гэтай сферы. Указ уступае ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання.

Кіраўнік дзяржавы 4 лістапада таксама выдаў дэкрэт № 21 «Аб унясенні змянення ў Палажэнне аб афіцыйным апублікаванні і ўступленні ў сілу прававых актаў Рэспублікі Беларусь».

«Згодна з Дэкрэтам у Палажэнні аб афіцыйным апублікаванні і ўступленні ў сілу прававых актаў замацоўваюцца асаблівасці ўступлення ў сілу нарматыўных прававых актаў, што датычацца правоў, свабод і абавязкаў індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асобаў. У прыватнасці, прадугледжана, што гэтыя акты ўступаюць у сілу пасля іх афіцыйнага апублікавання, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі», — паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

Дэкрэт уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання, з'яўляецца часовым і ў адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 101 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прадстаўляецца на разгляд Нацыянальнага сходу.

Указ і дэкрэт накіраваны на ўдасканаленне нарматворчага працэсу і прывядзенне прававых актаў кіраўніка дзяржавы ў адпаведнасць з законам ад 15 ліпеня 2008 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях нарматворчай дзейнасці».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ISSN 1990 - 763X

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости»

ИНФОРМИРУЕТ

В извещение о проведении 21 ноября 2008 г. открытого аукциона № 1-У-08 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), опубликованное 18 октября 2008 г. в газете «Звязда», **внести следующее изменение:**

часть 8 изложить в следующей редакции:

«Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством) обязаны:

в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона:

- произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение, включающую возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, в размере 4 % от начальной цены предмета торгов и 5 % от суммы превышения цены продажи соответствующего лота над его начальной ценой.».

УНП 190398583

DA7115

771990763008

«Вадзяная» арыфметыка

Жыхары, у каго няма лічыльніка, заплацяць па сабекошце?

Згодна з адпаведным заданнем, камунальнікі павінны забяспечыць да канца гэтага года 100-працэнтнае абсталяванне ўсяго жылфонду прыборамі ўліку вады. Аднак запланаваны ўзровень скараецца з вялікімі цяжкасцямі. Работнікі жыллёва-эксплуатацыйных службаў іншым разам схіляюцца да неправамерна жорсткіх адміністрацыйных мераў: кшталту, не ўстановіце прыборы ўліку — адключым воду. Зразумела, што такія дзеянні недапушчальныя. З іншага боку, праблема ўліку спажывання камунальных паслуг застаецца надзвычай актуальнай.

Як заўважыў генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Віктар Вараб'ёў, у сталіцы 565 тысяч асабістых «кватэрных» рахункаў. Па кожным з іх плацяжы выстаўляюцца індывідуальна, з улікам фактычнага спажывання канкрэтных аб'ёмаў паслуг. Паводле апошніх даных, у Мінску ўстаноўлена больш чым 8,3 тысячы групавых лічыльнікаў цеплавой энергіі, а таксама 5,8 тысячы сістэм рэгулявання. У такім разе аўтаматыка павінна адэкватна рэагаваць на тэмпературу паветра на двары.

У кватэрах мінчан павінна быць установлена больш чым 1,2 мільёна прыбораў уліку спажывання халоднай вады. Пакуль планавы ўзровень выкананы на 91,8 працэнта. Для таго каб выйсці на патрэбныя лічбы, засталося не так ужо шмат часу (менш чым два месяцы). Якім чынам плануецца выканаць заданне? Як адзначыў Віктар Вараб'ёў, сітуацыю прааналізавалі ва ўрадзе. Падчас вывучэння выяўлена 14 тыповых прычын, на падставе якіх жыхары адмаўляюцца ад установкі лічыльнікаў. Тры з іх былі прызнаны ўважлівымі. Існуюць сітуацыі, калі жыхар доўгі час адсутнічае і не можа своечасова прыбыць для ўстаноўкі лічыльніка. Немэтазгодна абсталёўваць такімі прыборамі вельмі зношаны жылфонд і дамы малапавярховай забудовы, якія ў перспектыве плануецца знесці. Таксама нельга ўстанавіць «вадамер» там, дзе для гэтага няма тэхнічнай магчымасці (да прыкладу, калі канструкцыі водазабеспячэння «замураваныя» ў сцены). Адпаведна, заўважыў Віктар Вараб'ёў, па сталіцы заданне па абсталяванні кватэр лічыльнікамі прапанавана зменшыць на 10 тысяч адзінак. Тыя жыхары, якія не трапілі ў катэгорыю ўважлівых прычын адмовы ад установкі прыбораў уліку, будуць разлічвацца за ваду па больш высокіх тарыфах. Паводле інфармацыі Віктара Вараб'ёва, плануецца, што з пачатку наступнага года жыхарам без лічыльнікаў выставяць адпаведныя плацяжы па сабекошце. У сярэднім гэта ў некалькі разоў больш, чым па «звычайным» тарыфе. Застаецца дадаць, што пакуль адпаведнае рашэнне канчаткова не зацверджана.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

У Мінску выселена 18 сем'яў неплацельшчыкаў

37 тысяч — у групе рызыкі?

Установлена, што ў сталіцы «жыроўкі» павінны прыходзіць да жыхароў не пазней, чым 10-га чысла. Разлікі за кватэру, у адпаведнасці з заканадаўствам, насельніцтвам ажыццяўляюцца да 25-га.

За кожны дзень спазнення налічваецца пеня. Калі запазычанасць «назапашваецца» на працягу доўгага часу, то пеня можа перавышаць асноўны доўг. У выніку чаго ў асобных «неабавязковых» жыхароў збіраюцца вялікія сумы. Як паведаміў генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Віктар Вараб'ёў, у пачатку гэтага года пратэрмінаваная запазычанасць насельніцтва па плацяжах за кватэру ў сталіцы перавышала 6 мільярдаў рублёў. Да сённяшняга часу гэтая сума зменшылася на 900 млн рублёў.

Аднак сітуацыя застаецца досыць вострай: як заўважыў Віктар Вараб'ёў, на 37 тысячах асабістых рахункаў мінчан (6 працэнтаў агульнай колькасці) «вісяць» даўгі. Камунальнікі прымяняюць да гэтых жыхароў самыя розныя меры ўздзеяння. Да самых жорсткіх — сёлета аформлена 120 іскаў у суд на высяленне з кватэры. 18 сем'яў неплацельшчыкаў ужо пазбавіліся такім чынам свайго жылля. Паводле слоў Віктара Вараб'ёва, заўзятыя даўжнікі перасяляюцца ў менш камфартабельныя памяшканні, прычым неабавязкова ў Мінску.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Пасля пісьма

Не так крыўдна было б, калі б грошы і час патраціла, але справу зрабіла

Пад такім загалоўкам двойчы — напрыканцы ліпеня і верасня — газета звярталася да праблем, з якімі сутыкнулася сп. Катлярэнка з в. Васільеўка...

Як паведаміў днямі кіраўнік спраў Добрушскага райвыканкама сп. Грамыка, увесь пакет дакументаў па афармленні дома, надворных пабудоў і зямельнага ўчастка Аленай Бенядзіктаўнай атрыманы; дырэктару РУП «Гомельскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» С.П. Лапіцкай указана на неабходнасць больш канкрэтнага тлумачэння парадку афармлення работ па тэхнічнай інвентарызацыі... Іншымі словамі, справа зроблена.

Напрыканцы афіцыйнага адказу зазначана, што ў Добрушскі выканаўчы камітэт сп. Катлярэнка не звярталася.

Хочацца верыць, дарэмна. Бо мясцовая ўлада на тое і мясцовая, каб вырашаць усе пытанні на месцы. І ў інтарэсах людзей.

Чорнаваллёвы гагач зрабіў «перапынак» у Мінску

У першы аўторак лістапада ў офіс грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» паступіла паведамленне аб тым, што ў сталіцы па завулку Калініна на газоне сядзіць незвычайная качка з доўгай вострай дзюбаю. Ужо на месцы спецыялісты АПБ адшукалі даволі рэдкую, занесеную ў Чырвоную кнігу Беларусі птушку — чорнаваллёвага гагача.

Паводле інфармацыі навукоўцаў, у Беларусі гняздуецца не больш за 15 пар чорнаваллёвых гагачоў. Усе месцы гнездавання знаходзяцца на поўначы краіны — у беларускім Паазер'і. Жывуць яны на азёрах сярод балот ці вялікіх лясных масіваў. Гагачы абмінаюць месцы, якія часта наведваюцца людзьмі. Гэта спецыялізаваны нырэц, які цудоўна плавае і можа працяглы час знаходзіцца пад вадой.

Жыццё чорнаваллёвай птушкі нельга назваць вельмі салодкім. Яны гінуць на азёрах, калі заблытваюцца ў рыбалоўных сетках. Маючы знешняе падабенства з качкамі, рэдкая птушка трапляе пад стрэлы паляўнічых. Не падабаецца гагачам, калі месцы іх гняздоўя наведваюць рыбаловы, паляўнічыя і турысты.

У Мінску чорнаваллёвы гагач апынуўся выпадкова. Магчыма, птушка шукала вадасховішча. Вядома, што напярэданні быў вельмі моцны туман і птушка магла збіцца са шляху. Былі выпадкі, калі птушкі прымалі мокры асфальт за гладзь вады. Пры знешнім агляддзе ў птушкі не было знойдзена нейкіх пашкоджанняў, толькі крыху пацярпелі фалангі лапак. Справа ў тым, што ў гагача лапкі вельмі моцна перамешчаны назад адносна тулава. Стаяць гарызантальна, як іншыя птушкі, гагачы не могуць, а вось для плавання такое размяшчэнне лапак падыходзіць ідэальна. Спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан Шайкін паведаміў рэдакцыі, што птушка сядзела на газоне нерухома, бо ўзлятае яна толькі з вады. Спецыялісты АПБ аглядзелі гагача, акальцавалі і выпусцілі на волю на рацэ за межамі горада. Хуткчэй за ўсё, гэта была пралётная птушка, якая накіроўваецца на зімоўку на поўдзень.

Сяргей КУРКАЧ.

Гагачу на рацэ лепш, чым у горадзе.

Як нас дураць

Затрыманы «спецыялісты» па доларавых падробках

У Мінску ў Цэнтральным раёне горада праваахоўнікамі былі затрыманы мужчына і жанчына, якія выраблялі і збывалі доларавыя фальшыўкі.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, гэтыя фальшываманетчыкі, якім па 37 гадоў, ужо маюць за спінай судзімасці: раней яны прыцягваліся да адказнасці неаднойчы, прычым за выраб падробных грошай. На гэты раз «спаліліся» прайдзісветы пры збыце двух падробных 20-доларавых купюр. Нягледзячы на тое, што з-пад «станка» крымінальнікаў выпускаліся падробкі невысокай якасці, прасцякоў, якія бралі іх як «чыстую манету», хапала. Прынамсі, у сталіцы, паводле папярэдняй інфармацыі, ім удалося збыць не адзін дзясятак падобных падробак. У якасці ж сваіх ахвяраў махляры выбіралі прадаўцоў садавіны, кветак, гаспадарчых тавараў, якія працуюць на рынках, у падземных пераходах, акрамя таго, на вуду да іх траплялі і нелегальныя прадаўцы. Расплачваючыся з пералічанымі прасцякамі «ліпай» за недарагі тавар, злачынцы атрымлівалі рэшту ўжо сапраўднымі грашыма. Прычым, дурачы такім чынам людзей, крымінальны «дуэт» разлічваў застаецца па-за полем зроку праваахоўнікаў: маўляў, не кожны з падманутых гандляроў рашыцца звярнуцца ў міліцыю. Логіка прайдзісветаў зразумелая: па-першае, валютная здзелка ажыццяўлялася незаконна, а, па-другое, меркавалі яны, той, хто згубіў усяго толькі 20 доларaў — не моцна на іх пакрыўдзіцца, таму што сума нязначная.

Як высветлілася, амерыканская валюта «штампавалася» парай нясхітрым чынам. На размнажальнай тэхніцы яны рабілі белыя копіі 20-доларавай купюры, выразалі яе рэквізіты (літаравыя і лічбавыя надпісы намінала), а затым пры дапамозе клея мацавалі іх на адпаведныя месцы купюр наміналам 1 долар. Паводле папярэдняй інфармацыі, атрыманы з «бізнэсу» навар мужчына з жанчынай трацілі на наркотыкі: гэты «дуэт» — наркаманы са стажам.

У ходзе вобыскаў, што былі праведзены ў іх дома, былі знойдзены яшчэ 59 нарыхтовак купюр наміналам па 20 доларaў ЗША і 4 гатовыя фальшыўкі. Махляры арыштаваныя, а вось пацярпелых супрацоўнікі міліцыі просяць звяртацца ў праваахоўныя органы. І заўпэўніваюць, што ў такім выпадку асобы, якія паведамілі аб учыненні злачынства, да адказнасці за незаконныя валютныя аперацыі прыцягнуты не будуць.

Ігар ГРЫШЫН.

Шэсць чвэрцьфіналістаў вызначана

Вызначыліся першыя шэсць удзельнікаў чвэрцьфіналу Кубка Беларусі 2008/2009. Нядаўнія вынікі першых матчаў не пакідалі аднаму з сапернікаў ніякіх шанцаў. Зноў пяць галоў у вароты слонімскага «Камунальніка» «закінуў» салігорскі «Шахцёр». Крыху менш, сем мячоў за два матчы «накідаў» у вароты сталічнага «Лакаматыва» навапалацкі «Нафтан». Прычым апошняя гасцявая перамога 4:0 аказалася нават буйнейшай за хатнюю. Столькі ж разоў за дзве гульні ўскрыў абарону землякоў з «Дынама-Белкард» гродзенскі «Нёман». У апошнім матчы, праўда, прадстаўнік вышэйшай лігі дазволіў саперніку забіць гол прэстыжу — 3:1. Сціпла, усяго 1:0, перамог «Белшыну» ў Брэсце «Граніт-Мікашэвічы». «Гомель» з лікам 4:2 перамог пінскую «Хвалю». Сур'ёзнае супраціўленне аказала толькі «Смаргонь». Прайграўшы першы матч МТЗ-РІПА з лікам 0:4, падапечныя Георгія Кандрацьева паядынак у адказ звялі да нічыёй 2:2. Гульня ў Смаргоні была адзначана ўжо звыклым выхадам на поле кубкавага матча ў якасці футбаліста трэнера МТЗ-РІПА Юрыя Пудышыва. Чэмпіён СССР выйшаў на замену на 77-й хвіліне.

Абзац

■ Новыя гранічныя тарыфы за 1 км праезду пасажыраў у аўтобусах рэгулярных маршрутаў прыгарадных зносінаў зацвердзіў Мінгарвыканкам. Так, на звычайных маршрутах у аўтобусах агульнага тыпу тарыф павялічыўся з Br80 да Br102 (за 1 км), у аўтобусах з мяккімі крэсламі — з 83,2 да Br106. Паездка ў хуткасных маршрутах абыдзецца ў «жорсткім» аўтобусе Br132,6, у «мяккім» — Br137,8 за 1 км, на дадатковых — Br137,7 і Br143,1 і экспрэсных маршрутах — Br153 і Br159 за 1 км. У перавозчыкаў цэны могуць быць і ніжэйшымі. Прыгараднымі лічацца перавозкі да 50 км ад мяжы горада.

■ **Аўтацягнік «Даймлер-Крайслер» на 237-м кіламетры аўтадарогі Брэст—Мінск у Баранавіцкім раёне пратараніў аўтацыстэрну ЗіЛ-130, што стаяла на ўзбочыне. У ёй знаходзіўся звадкаваны кісларод. Цыстэрна перавярнулася, кісларод разліўся. Вадзіцель атрымаў чэрапна-мазгавую траўму і быў дастаўлены ў бальніцу. Супрацоўнікі МНС перапампавалі кісларод у іншую ёмістасць, у выніку чаго ўдалося прадухіліць нанясенне ўрону навакольнаму асяроддзю.**

■ Тэндэнцыя зніжэння дзіцячай смяротнасці адзначаецца ў Беларусі, паведаміў першы намеснік міністра аховы здароўя Роберт Часнойць на калегіі міністэрства. Паводле яго даных, за 9 месяцаў гэтага года дзіцячая смяротнасць у Беларусі зменшылася на 21 працэнт у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года і складае 4,5 праміле (у студзені—верасні 2007 года — 5,7 праміле). Роберт Часнойць падкрэсліў, што гэты паказчык у Беларусі самы нізкі сярод краін СНД. Узровень дзіцячай смяротнасці ў перынатальны перыяд знізіўся з 5,8 на 1 тыс. народжаных у студзені—верасні 2007 года да 5,2.

■ **У Брэсце на будоўлю разам з грунтам прывезлі 6 стрэлаў да ручнога супрацьтанкавага гранатамёта РПГ-7. Яны абясшкоджаныя групай размініравання.**

■ Цэны на сланечнікавы алей, што пастаўляецца з Малдовы, могуць быць зніжаныя. Самае буйное прадпрыемства гэтай галіны, АТ «Флоара Соарэлуй», зменшыла заводскія цэны на алей у сярэднім на 30 працэнтаў. Зніжэнне коштаў тлумачыцца вельмі добрым ураджаем сланечніка.

■ **Міністр унутраных спраў Мексікі і яшчэ 7 чалавек загінулі пры крушэнні самалёта. Трагедыя адбылася ў цэнтры Мехіка. Пасля падзення самалёта адбыўся моцны выбух, у выніку якога пацярпелі каля 40 чалавек. З-за пажару, які пачаўся, згарэла каля 30 аўтамабіляў. Па меркаванні экспертаў, самалёт упаў з-за тэхнічнай няспраўнасці.**

■ Вадзіцель аўтамашыны «Форд-транзіт» збіў у Рэчыцкім раёне дзвюх жанчын, якія галасавалі, адна з іх загінула. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, пацярпелыя аказвалі паслугі інтымнага характару. Вадзіцель сам пазваніў у міліцыю.

■ **У Мінску даражэе праезд у таксі. Новыя тарыфы зарэгістравалі большасць перавозчыкаў. Максімальны кошт праезду вырас на 20 працэнтаў.**

■ У Германіі, непадалёк ад Гановера, згарэў аўтобус з 30 пасажырамі. У выніку інцыдэнту загінулі 20 чалавек. Выратавацца ўдалося толькі 10 пасажырам. Прычынай, хутчэй за ўсё, стала тэхнічная няспраўнасць аўтобуса.

■ **Новае пакаленне парфумы, якая робіць жанчыну маладзейшай на 10 гадоў, з'явілася на прылаўках магазінаў Лондана. Яна зроблена па найноўшай тэхналогіі з адметнай малекулай, якая здольная ўздзейнічаць на зоны чалавечага мозга, што адказваюць за эмоцыі. Дзякуючы гэтаму жанчына не толькі сама адчувае сябе маладой, але і перадае гэтае пачуццё навакольным. Спецыялісты лічаць, што новая парфума дзейнічае на ўзроўні падсвядомасці, блакуючы рацыянальнае мысленне.**

Поўны абзац

■ Даволі незвычайнае відовішча давялося назіраць работнікам аднаго з ЖЭСаў Харкава, калі яны вырашылі зазірнуць на гарышча свайго шматпавярховіка. Нагодай для візіту стала скарга адной з жыхарак апошняга паверха — нейкі дзядуля рэгулярна лазіць на дах. Падчас агляду было выяўлена больш за 200 тушак галубоў, кожная з якіх была старанна раздзеланая і падсушаная на імправізаванай буржуйцы, што таксама знаходзілася тут. Сумесная засада прынесла вынікі — тым самым дзядулем аказаўся сусед з другога пад'езда, як выявілася, даволі забяспечаны чалавек. Да гэтага ніхто не ведаў, што свой дабрабыт ён зарабіў... збіраючы міласціну. І хоць грошай на жыццё хапала, ён захаваў слабасць да галубінага мяса. Як стала вядома, сваё кулінарнае майстэрства 62-гадоваму харкаўчаніну давядзецца адточваць у іншым месцы.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ВЯСКОВЫЯ РАЗБОРКІ

У вёсцы Дзям'янкі Добрушскага раёна распіццё бутэлькі гаралкі «на траіх» ледзь не закончылася трагедыяй. Яблыкам разладу стала малочная фляга, якую двое жыхароў вёскі Дубовы Лог адабралі ў гаспадара дома, 56-гадовага жыхара вёскі Дзям'янкі. Як развівалася падзеі далей, зараз высвятляе следства. Пакуль жа вядома, што адзін са злачынцаў — 21-гадовы, раней судзімы, нідзе не працуючы — накінуў на шыю пацярпеламу вяроўку, сеў на матацыкл і каля 10 метраў працягнуў яго па зямлі. Пасля чаго госці адкрыта ўкралі 35 тысяч рублёў. Пацярпелы атрымаў траўмы, але цяпер яго стан здароў'я не з'яўляецца небяспечным. Адзін са злачынцаў затрыманы, другога, 1971 года нараджэння, шукае міліцыя. Узбуджана крымінальная справа.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВЕДАЎ, ЧАГО ЎЦЯКАЎ

У Пінску на вул. Я. Маўра на пешахода наехаў мапед, якім кіраваў 19-гадовы хлопец.

Ад удару пешаход упаў на дарогу і на яго наскочыў «Фольксваген», які ехаў следам. Вадзіцель аўтамашыны збег з месца здарэння, але быў затрыманы нарадам ДАІ. Пацярпелы памёр на месцы. У вадзіцеля мапеда кроў на праверку ўзялі, а вось вадзіцель-уцякач ад гэтай працэдуры адмовіўся. Узбуджана крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

МУЖЫК, НАКАЧВАЙ МУСКУЛЫ!

А то і куры цябе заклююць. Гэта — наказ 30-гадоваму гамяльчаніну, які і ў школьныя гады, і пасля лічыў заняткі фізкультурай дарэмнай справай. За што і паплаціўся. У бары «Галактыка» ў яго ўзнік канфлікт з 27-гадовай дзяўчынай, што была з кагорты жанчын, якія каня на скаку маглі спыніць. Дык тая такую прачуханку кулакамі дала мужыку, што той толькі размазваў слёзы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» Управління аховы здароўя Мінаблвыканкама 8 (017) 220 20 25

11 лістапада:

9.00—12.00 — загадчык сектара лячэбна-прафілактычнай дапамогі даросламу насельніцтву Таіса Уладзіміраўна БАРАВАЯ.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансэра Людміла Анатольеўна АНДРЭЕВА.

За ўхіленне ад падаткаў — Br61 млн штрафу

Такую суму жыхар Віцебска заплаціць за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць і ўхіленне ад падаткаў. Аб гэтым паведаміў пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах і аналізе судовай практыкі Дзмітрый АРЭХВА.

Шырокую працоўную, але незаконную дзейнасць 43-гадовы мужчына разгарнуў у абласным цэнтры. Ён зарэгістраваў у належных органах падстаўнога чалавека ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, па дакументах якога працаваў сам, і з верасня па снежань 2006 года атрымаў даход у памеры Br42 млн. Акрамя таго, займаючы пасаду дырэктара аднаго з віцебскіх прыватных унітарных прадпрыемстваў, мужчына падаваў у падатковую інспекцыю звесткі аб тым, што прадпрыемства знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі і ніякую фінансава-гаспадарчую дзейнасць не ажыццяўляе. Махінатар прадаў абсталяванне на суму больш за Br81 млн, а падаткі і зборы ў Br15 млн не заплаціў. Прыгаворам суда жыхару Віцебска назначана пакаранне ў выглядзе 2,6 года пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання прыгавора. Дарэчы, раней мужчына ўжо быў асуджаны за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць і па Br100 млн, прысуджаных па папярэдніх справах, яшчэ не разлічыўся.

Вольга ДАВЫДАВА, БЕЛТА.

Пажары ад шчылін у печах

Толькі за адзін тыдзень у жыхароў сталічнай вобласці пацярпелі ад агню пяць пабудоў з-за парушэнняў правілаў пажарнай бяспекі пры эксплуатацыі пячнога ацяплення.

Сярод іх — дом і дача. Падчас аднаго з пажараў пенсіянер з вёскі Аляхновічы Маладзечанскага раёна атрымаў значныя апёкі і ў цяжкім стане быў дастаўлены ў бальніцу. Як высветлілася, мужчына паліў печ з адчыненай дзверцай. Сярод найбольш распаўсюджаных прычын, якія прыводзяць да пажараў, у Мінскім абласным упраўленні МНС найперш назвалі шчыліны ў печах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АДМЕТНЫМ СТАЎ НЕ ТОЛЬКІ НОВЫ ПРЭЗІДЭНТ ЗША, АЛЕ І ПЕРШАЯ ЛЭДЗІ

Паводле апошняй інфармацыі, дэмакрат Абама на выбарах прэзідэнта ЗША набраў 62,3 мільёна галасоў амерыканцаў, у той час як рэспубліканец Джон Макейн — 55,2 мільёна. Абаме атрымалася забяспечыць сабе больш за 340 галасоў у калегіі выбаршчыкаў, тады як для перамогі дастаткова было і 270. Галасаванне выбаршчыкаў адбудзецца ў снежні, а інаўгурацыя Абамы і яго напарніка — будучага віцэ-прэзідэнта — Джо Байдэна павінна прайсці 20 студзеня 2009 года.

Натуральна, у ЗША памяняўся не толькі прэзідэнт, але і першая лэдзі. Замест рахманай памагатай, якая заўсёды знаходзіцца ў цэню свайго высокапастаўленага мужа, якой была Лора Буш, на палітычную сцэну выходзіць незалежная, разважная і стыльная Мішэль Абама, юрыст па адукацыі. Як пішуць амерыканскія СМІ, Мішэль стварае ўражанне ідэальнай: яна разумная і думае самастойна, яе знешняя прывабнасць выглядае натуральна, трымаецца на публіцы яна пышна, у яе ёсць такая важная якасць, як самаіронія, апранаецца яна не занадта сэксапільна, але з густам. Акрамя таго, яна разбіраецца ў мужчынах і разумее, на каго можна рабіць стаўкі — нездарма ж, нягледзячы на адтапыраныя вушы, яна ўсё ж выбрала сабе мужам Барака Абаму.

ТЭРМІН ПАЎНАМОЦТВАЎ МЯДЗВЕДЗЕВА ЗАСТАНЕЦЦА РАНЕЙШЫМ

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў учора звярнуўся з першым Пасланнем да Федэральнага Сходу.

Сярод іншага Мядзведзеў прапанаваў павялічыць тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў да шасці гадоў, а паўнамоцтваў дэпутатаў Дзярждумы — да пяці гадоў. Аднак, як заявіла начальнік дзяржаўна-прававога ўпраўлення прэзідэнта РФ Ларыса Брычава, гэта не будзе распаўсюджвацца на дзеючых кіраўніка дзяржавы і дэпутатаў Думы. Паводле яе слоў, для занясення змяненняў у канстытуцыю рэферэндум не спатрэбіцца. Змяненні ўступяць у сілу пасля ўхвалення адпаведнага канстытуцыйнага закона рэгіянальнымі парламентамі.

АМЕРЫКАНСКІЯ ВАЕННЫЯ РАЗБАМБІЛІ АФГАНСКУЮ ВЁСКУ, ДЗЕ ПРАХОДЗІЛА ВЯСЕЛЛЕ

У выніку авіяўдару загінулі дзясяткі чалавек, у асноўным, жанчыны і дзеці, паведамляе АР са спасылкай на сведчанні пацярпелых, дастаўленых у бальніцу Кандагара.

Амерыканскае камандаванне заявіла, што не мае ніякай інфармацыі аб гэтым інцыдэнце. Аднак яе пацвердзіў прэзідэнт Афганістана Хамід Карзай, заявіўшы на прэс-канферэнцыі ў Кабуле аб шматлікіх ахвярах сярод мірнага насельніцтва ў выніку авіяўдараў.

Споўнілася 56 гадоў з дня ўтварэння службы аховы

ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ — ЗАБЯСПЕЧВАЦЬ БЯСПЕКУ...

Ва ўсе часы ва ўсіх дзяржавах свету існавалі структуры, якія выконвалі ахоўныя функцыі. У нашай краіне ахову фізічных асобаў, аб'ектаў усіх формаў уласнасці памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян, а таксама падтрыманне грамадскага парадку ў зонах пастоў і маршрутаў патрулявання забяспечваюць падраздзяленні Дэпартамента аховы МУС Беларусі.

Які партрэт сённяшняга супрацоўніка падраздзялення аховы, і што за патрабаванні прад'яўляюцца да кандыдатаў на згаданую службу? На гэтыя пытанні згадзіўся адказаць **палкоўнік міліцыі Аляксандр ВАЛУЕВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення кадраў Дэпартамента аховы — начальнік аддзела камплектавання.**

— Крыштальная чысціня, высокая культура і неадкладнае выкананне патрабаванняў закона ў спалучэнні з разуменнем службовага абавязку, мужнасцю і рашучасцю ў барацьбе са злачыннасцю — вось абавязковыя якасці кожнага з супрацоўнікаў Дэпартамента аховы. Штогод у тэрытарыяльных падраздзяленнях аховы вывучаецца каля 3000 кандыдатаў з ліку цывільнай моладзі, з якіх толькі 30 — 40 працэнтаў прымаюцца на службу.

— Чаму такі нізкі працэнт?

— Ёсць шэраг прычын. Па-першае, некаторыя кандыдаты пасля першапачатковай азнаямленчай і растлумачальнай гутаркі адмаўляюцца ад паступлення на службу, калі даведваюцца, што за нагрузка і адказнасць кладзецца на супрацоўніка міліцыі і якія патрабаванні прад'яўляюцца да выканання імі службовай і транспартнай дысцыпліны.

Па-другое, многія з прэтэндэнтаў маюць нездавальняючае здароўе. Напрыклад, са 175 чалавек, якія прайшлі ваенна-ўрачэбную камісію сёлета ў маі-чэрвені, 56 прызнаны непрыдатнымі да службы.

Па-трэцяе, падчас вывучэння кандыдатаў выяўляюцца звесткі, якія кампраметуюць, перашкаджаюць прыёму на службу ў органы ўнутраных спраў.

Па-чацвёртае, асобныя грамадзяне не маюць той фізічнай падрыхтоўкі, якой павінен валодаць вартавы правапарадку.

— А які ўзровень адукацыі кандыдатаў?

— Каб набыць статус радавога і малодшага начальніцкага складу, прасцей кажучы, быць прызначаным на пасаду міліцыянера, міліцыянера-вадзіцеля або міліцыянера-кінолага, дастаткова мець атэстат аб сярэдняй адукацыі. Разам з тым, ажыццяўляючы кадравую палітыку Міністэрства ўнутраных спраў, у падраздзяленнях аховы вядзецца планамернае камплектаванне ўказаных пасад кандыдатамі з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй. Для гэтага праводзіцца рэгулярная агітацыйна-растлумачальная работа ва ўстановах адукацыі. Як вынік, за 9 месяцаў 2008 года на службу прынята 47 чалавек, якія маюць вышэйшую адукацыю, і 90 — з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, а гэта практычна 40 працэнтаў ад агульнай колькасці прынятых на службу.

— Ці ёсць іншыя патрабаванні?

— Перш чым паступіць на службу да нас, кандыдат павінен прайсці тэрміновую ваенную службу. Толькі ў выключных выпадках, пры наяўнасці вышэйшай адукацыі, можа быць прынята рашэнне не ўлічваць гэтага патрабавання. Прыярытэт аддаецца былым вайскоўцам унутраных войскаў МУС.

Адной з формаў вывучэння кандыдатаў на службу з'яўляецца сістэма рэкамендацыйных пісьмаў (паручыцельстваў), якая дзейнічае ў падраздзяленнях Дэпартамента аховы на працягу дзесяці гадоў. Вывучэнне крыніц камплектавання кадраў у органы ўнутраных спраў паказала, што больш за 90 працэнтаў тых, хто паступае на службу ў міліцыю, прымаюцца па рэкамендацыях мясцовых органаў улады, накіраванняў працоўных калектываў і вайсковых часцей.

— Ці існуе ўзроставы цэнз?

— На пасады радавога і малодшага начальніцкага складу органаў унутраных спраў прымаюцца грамадзяне, як правіла, не старэйшыя за 25 гадоў, а на пасады сярэдняга і старшага начальніцкага складу — не старэйшыя за 30 гадоў. Але могуць быць прынятыя грамадзяне і старэйшыя, калі да дасягнення межавага ўзросту знаходжання на службе яны будуць мець права на пенсію за выслугу гадоў. Што гэта азначае? Што пры дасягненні супрацоўнікам малодшага начальніцкага складу 45 гадоў ён павінен мець выслугу на ваеннай службе або на службе ў органах унутраных спраў 20 гадоў і больш.

— Наколькі высокая адказнасць кадравых кіраўнікоў дэпартамента перад беларускім грамадствам?

— Адна з прыярытэтных задач, якую ставіць перад сабой кіраўніцтва Дэпартамента аховы, — дабіцца павышэння стаўлення грамадзян да работы супрацоўнікаў Дэпартамента аховы. Поспех у выкананні нашай работы ў значнай ступені залежыць як ад якасці кадраў, што адбіраюцца на службу, так і ад ацэнкі насельніцтвам таго, ці годна мы выконваем свае службовыя абавязкі.

Аляксандр ГЕРАСІМАЎ, прэс-сакратар Дэпартамента аховы МУС.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«8» декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион

по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Червенского района, и права заключения договоров аренды земельного участка, необходимого для их обслуживания

На аукционные торги выставляются одним лотом:

Предмет аукциона	**рентгенлаборатория с 3 пристройками (инв. № 615/С-23529)**	**лечебный корпус (инв. № 615/С-15816), в том числе: подвал и 4 пристройки, 2 гаража, бензосклад, сарай, склад, склад с пристройкой, тамбур, погреб, уборная и забор деревянный**	**здание столовой с пристройкой (инв. № 615/С-23530)**
	и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания		
Местоположение недвижимого имущества	Минская область, Червенский район, г.п. Смиловичи, ул. Революционная, 2		
Начальная цена предмета аукциона, рублей	385 576 210 (в том числе: недвижимое имущество – 178 469 090, право заключения договора аренды земельного участка – 207 107 120)		
Сумма задатка для участия в аукционе, рублей	20 000 000		
Характеристика недвижимого имущества	Общая площадь 272,7 кв.м. Год постройки – 1965. Одноэтажное здание, фундамент бутобетонный ленточный, стены и перегородки сборно-щитовые, крыша шиферная, полы дощатые. Имеются инженерные коммуникации	Общая площадь 559,2 кв.м. Год постройки – 1918. Одноэтажное, фундамент бутобетонный ленточный, стены и перегородки бревенчатые и дощатые, крыша шиферная, полы дощатые окрашенные. Имеются инженерные коммуникации	Общая площадь 117,1 кв.м. Год постройки – 1918. Одноэтажное здание, фундамент бутобетонный, стены и перегородки бревенчатые, крыша шиферная, полы дощатые. Имеются инженерные коммуникации
Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	Площадь – 1,5191 га, срок аренды земельного участка – 50 лет. Земельный участок площадью 0,0304 га имеет ограничение в использовании, т.к. расположен в охранной зоне систем газоснабжения. Земельный участок изъят для обслуживания зданий и сооружений		
Продавец недвижимого имущества	Учреждение здравоохранения «Червенская центральная районная больница», Минская область, г. Червень, ул. Барыкина, 60 тел. 8 (01714) 5 47 83		
Арендодатель земельного участка	Червенский районный исполнительный комитет		

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

1. Червенский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**2. Победитель аукциона в теч

7 ЛІСТАПАДА АДБУДЗЕЦЦА ПАДАРОЖЖА НАЗАД У СССР

Яго прапануе сваім гледачам тэлеканал АНТ, які спецыяльна да гэтага дня падрыхтаваў падарунак — тры пастановачныя канцэрты «Назад у СССР».

60-я. Не спяшайцеся правяраць, ці ўсё ў парадку з тэлевізарам, калі ўбачыце гэты канцэрт у чорна-белай колеравай гаме. Усё так і павінна быць — гэта спосаб выразна перадаць дух таго часу (каляровае тэлебачанне ў СССР вядзе адлік толькі з 1967 года). У астатнім 60-я «пазнаюцца» па прычосках, касцюмах, сцэнічных дэкарацыях і, натуральна, па рэпертуары: рок-н-рол Элвіса Прэслі і «Бітлз», хіты «Апошняя электрычка», «Чорны кот», «Песня пра зайцоў», «Ландышы», «Бэсамэ мучо», «Ямайка» і г.д.

70-я. Паліна Смолава ў ролі жанчыны, якая спявае — пра «Арлекіна», Жанэт у вобразе Марфы Васільеўны з кінафільма «Іван Васільевіч мяняе прафесію», Саша Нэма з аповедам пра ўсё, у чым радасць кожнага дня — самае цікавае будзе ў тым, каб пазнаць папулярных беларускіх артыстаў у нязвыклых вобразах. У якасці фінальнага акорду — харавое выкананне славутай «Мой адрас — Савецкі Саюз», адмыслова для тых, хто яшчэ памятае, пра што гаворка.

80-я. У падарожжы па гэтым дзесяцігоддзі гледачоў будуць суправаджаць вядучыя Яўген Лашкоўскі і Марыя Лемешава, якія нагадаюць пра атрыбуты часу, ад Алімпіяды-80 да першых джынсавых куртак Levis. У музычным сэнсе эпоху прадставяць хіты Boney M і Modern Talking, «Ласкавага маю» і «Міражу», добра знаёмыя песні «Трава ля дома», «Малінаўка», «Цудоўнае далёка», «Ягада-маліна», «Паварот», «Фелічыта» і іншыя.

Акрамя канцэртаў, у святочным эфіры 7 лістапада чакаюцца дзве прэм'еры: поўнаметражны мультфільм «Ілья Мурамец і Салавей разбойнік» і фільм М. Міхалкова «Дванаццаць».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Бяседныя песні

Развітанне

Моладзь акрыляецца рамантыкай. Гэтае, дараванае прыродай, прамяністае пачуццё кліча юнакоў і дзяўчат наперад, за далягляд, каб спазнаваць, рабіць адкрыцці, самасцвярджацца.

Рамантыка вымагае і самаахвярнасці. Дзеля справядлівасці, дзеля роўнасці. Моладзь востра адчувае сацыяльную неўладкаванасць, духоўны прыгнёт і смела, без аглядкі рашуча выступае на абарону годнасці, чалавечнасці. Так было заўсёды і паўсюль. І сто гадоў таму моладзь, акрыленая рэвалюцыйнай рамантыкай, адважна ўключылася ў перабудову грамадскіх адносінаў...

Мінуў час. Векапомны час для ўсёй планеты. Але пакуль яшчэ папрыродцэнтрысцку не прааналізаваны і не асэнсаваны...

Змяніўся час, акалічнасці. А песні засталіся. Бо ў іх і рэчаіснасць — суровая, бязлітасная і адначасова жыццесцвярджальная, і каханне — трывожнае, імклівае, і рамантыка — рэвалюцыйная, асвятляльная. Гэтыя песні блізкія нашым сучаснікам. І па духу, і па сутнасці. Яны пабуджаюць дзейнічаць, ствараць, наладжваць паразуменне, усталёўваць справядлівасць.

Кранальна ўспрымаецца на бяседзе і песня «Развітанне», якая ўваскрашае падзеі грамадзянскай вайны, хоць Міхаіл Ісакоўскі напісаў верш значна пазней, у 1935 годзе. Дзеля Радзімы, яе светлай будучыні — сцвярджаецца ў песні — патрабуецца актыўная жыццядзейнасць, а пры неабходнасці і самаахвяраванне.

Верш Міхаіла Ісакоўскага
Музыка Дзмітрыя Пакраса

Дан приказ: ему — на запад,
Ей — в другую сторону...
Уходили комсомольцы
На гражданскую войну.

Уходили, расставались,
Покидая тихий край.
— Ты мне что-нибудь, родная,
На прощанье пожелай.

И родная отвечала:
— Я желаю всей душой,
Если смерти — то мгновенной,
Если раны — небольшой.

А всего сильней желаю
Я тебе, товарищ мой,
Чтоб со скорою победой
Возвратился ты домой.

Он пожал подруге руку,
Глянул в девичье лицо:
— А еще, тебя прошу я,
Напиши мне письмецо.

— Но куда же напишу я?
Как я твой узнаю путь?
— Все равно, — сказал он тихо, —
Напиши... Куда-нибудь!

Дан приказ: ему — на запад,
Ей — в другую сторону...
Уходили комсомольцы
На гражданскую войну.

Камсамольскія актывісты Белдзяржуніверсітэта, якія па-студэнцку весела адзначалі 50-годдзе камсамола, прасілі змясціць любімую моладдзю песню «Развітанне» і ёю прывітаць сваіх калегаў, равеснікаў.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Сямейны вечар. Задушэўная размова. Успаміны, справы, мары, музыка... Нібыта прыгожы рамантычны фільм, які зараджае надзеямі ўсіх, хто развучыўся спадзявацца. Ці баль са шлейфамі казачных сукенак, дзе гасцінная гаспадыня ведае ўсё пра тых, хто да яе прыйшоў. Чаго тут дзівіцца — навучылася ў кіно «На спіне ў чорнага ката» ў сваёй гераіні анёла Кэт. Вера Палякова паспяхова карысталася гэтымі сакрэтамі падчас сваёй творчай вечарыны і ніколькі не хавала іх ад іншых.

Актрыса і тэлевядучая шчыра прызналася ў тым, што адзначае свой першы прыкметны юбілей. Што першы раз на экране яна з'явілася, калі ўручала ўзнагароду Міхаілу Баярскаму — у тэлесерыяле. Але з таго часу было шмат роляў. Спраўджваецца і галоўная роля для любой жанчыны: дзевяцігадовы сын напярэдадні дня нараджэння парадаваў маму выдатнымі адзнакамі за чвэрць. А яна адчувае сябе настолькі шчаслівай — хочацца дзяліцца радасцю з усім светам. Што гатовая памерці дзеля кахання — нават рыхтуецца гэта зрабіць... на прэм'еры мюзікла «Байкер». У гэтых прызнаннях, як і ў новай ролі, ёсць прыкметы чараўніцтва.

МАСТАЦКАЯ ШЧЫРАСЦЬ

— Я не маю права на няшчырасць, — прызнаецца **Вера ПАЛЯКОВА** ў інтэрв'ю нашай газеце. — На жаночым ток-шоу працую, дзе важна выклікаць у чалавека прыхільнасць да сябе, каб ён даверыўся, раскрыўся перад камерай. Так жа і з гледачамі ў тэатральнай зале. Гледачы вельмі разумныя, адчуваюць, калі іх падманваюць, асабліва цяпер, калі ёсць цікавасць да тэатра: у нас жа пастаянна поўныя залы! На вечарыне былі людзі, якія ведаюць маю творчасць і ходзяць на мае спектаклі. Гэта мой глядач. Ён абавязкова павінен ведаць усё пра мяне.

— Шчырасці ў прафесіі вы вучыліся ў Лідзіі Манаковай, выкладчыка Беларускай акадэміі мастацтваў. Утварыў фурор выпускны спектакль вашага курса «Туці-фруці». І напэўна з самымі смелымі надзеямі вы прыходзілі ў прафесію. Ці спраўдзіліся яны?

— Па-першае, спраўдзілася тое, што я маю працу. Мяне ўсе пытаюцца, што б я хацела сыграць?.. А я хачу проста іграць! Няма канкрэтнай ролі-мары ў тэатры ці кіно. Мне важна ўжо тое, што ёсць праца, якая прыносіць мне задавальненне.

Ведаеце, я вельмі люблю сваіх студэнтаў, якім сама выкладаю ў Акадэміі мастацтваў: кожны курс прыходзіць з амбіцыямі і жаданнем перавярнуць увесь творчы свет. І я была такая. І мне хацелася ўзварушыць тэатральны свет. Мы спадзяваліся, што будзем працаваць разам усім курсам, ці створым свой тэатр. Насамрэч гэта мара кожнага курса. Але калі адзін курс з дваццаці здолее сапраўды стварыць свой тэатр, то гэта ўжо будзе вялікае творчае адкрыццё. Мы ж у выніку разышліся па розных тэатрах. І толькі ў пяці чалавек удала склаўся творчы лёс. А некаторыя проста сышлі з гэтай прафесіі. На жаль, ці на шчасце — магчыма, столькі артыстаў і не патрэбна ў Беларусі. Сёння шмат старонніх людзей у нашай прафесіі, і ўвогуле на сцэне. Я разумею: яна заварожвае, і людзі рвуцца да вяршыняў. А потым мы бачым у тэатры слабыя спектаклі, на эстрадзе бездапаможных выканаўцаў. Каб гэтага не было, важна падтрымаць менавіта таленавітых асобаў, даць ім больш магчымасцяў праявіцца.

— Вашы здольнасці былі адзначаны — па працах у фільмах і тэатрах. Але была адна роля, дзе ўсё трымалася на эмоцыях, у спектаклі «Погляд незнаёмца» паводле сучаснага нямецкага аўтара. А вам з якой драматургіяй больш падабаецца працаваць?

— За ролю Веры ў гэтым спектаклі я атрымала прыз за лепшую жаночую ролю на фестывалі Гётэ, які праходзіў у Беларусі. Гэта для мяне была цікавая спроба працы з сучаснай драматургіяй. Але калі шчыра, я не вельмі люблю эксперыменты, абстракцыі, тэатр абсурду... Больш задавальненне атрымліваю ад класікі. Вельмі люблю касцюмаваныя спектаклі — з высокім маўленнем, прыгожымі дэкарацыямі, сукенкамі, капелюшамі, кінжаламі. Нездарма ж я выкладаю мастацтва бою на сцэне. Гістарычныя спектаклі, як і гістарычныя фільмы, для мяне найбольш прыцягальныя. Я люблю і сучасныя спектаклі, але калі яны рэалістычныя. Мне здаецца, што як актрыса я магу больш дакладна данесці думку, якая закладзена ў спектаклі, калі яна выкладзена простай для гледача мовай. Сучасныя тэатральныя формы цікавыя, але больш — для пэўнай часткі публікі, для эстэтаў. А я бліжэй да народа. Мне цікавы рэалізм. І мы імкнёмся яго прыгожа даносіць. Каб паход у тэатр стаў прыгожым святам і чалавек пры гэтым нешта для сябе разумеў.

— Чаму тады вы не працуеце ў акадэмічных тэатрах, але выбралі тэатр-студыю кінаакцёра?

— Я прыйшла ў студыю кінаакцёра з акадэмічных тэатраў. Гэта быў свядомы выбар. Я працавала ў Купалаўскім тэатры. Нават 60 дзён працавала ў ТЮГу — па размеркаванні. І ў Рускім тэатры ўвогуле была на галоўных ролях. Потым у Малым тэатры іграла галоўную ролю ў адным спектаклі. Дарэчы, мне такі варыянт тэатра спадабаўся больш, калі працуюць запрошаныя артысты: няма чаго людзям дзяліць, няма ўнутраных плыняў і інтрыг. Таму прайшоўшы праз акадэмічныя тэатры, я ўсвядоміла, што яны мне не падыходзяць. Ёсць тэатр — і ўсё. Ты павінен ім жыць, і больш ніякага жыцця не існуе. А з маім буйным тэмпераментам аднаго тэатра мала. Хацелася паспрабаваць сябе і на тэлебачанні, і ў кіно. Якраз тады, калі пачыналася кар'ера ў кіно, я сышла з Рускага тэатра, разумеючы, што задыхнуся ў замкнёнай прасторы. А праца ў тэатры-студыі кінаакцёра дазваляе акцёрам і гучаць, і здымацца, і праявіць сябе ў розных акцыях і канцэртах. І тэатр ад гэтага толькі выйграе — у нас вельмі вядомыя артысты, якія пастаянна здымаюцца, увесь час навідавоку, на слыху. Сам тэатр маленькі, значыць і праблем меней. У нас няма такога моманту, як у Купалаўскім тэатры, дзе вялікая трупа, адбываецца змена пакаленняў, у якіх розныя інтарэсы. У нас усё больш кампактна. Безумоўна, бываюць «сямейныя» праблемы, але яны не перарастаюць у глабальныя. Самае галоўнае — усё пакідаць за кулісамі. А потым я магу выказаць сваё меркаванне. Я абсалютна не канфліктны чалавек. Выбуховы, але не канфліктны.

— Важна даваць выпуск нейкім эмоцыям?

— Я пастаянна выплёскваю свае эмоцыі. Бо калі я іх стану трымаць унутры, будзе толькі горш: яны накопліваюцца — і ўвогуле жах што можа здарыцца... Мае родныя і блізкія ведаюць, што са мной складана, але цярпяць. Ведаюць, што я ўсіх люблю і ўжо праз хвіліну пасля выбуху з усімі паміруся.

— А што такое страшнае можа здарыцца з-за эмоцый?

— Здараецца, я ўваходжу ў стан дэпрэсіі. Потым доўга не магу з яе выйсці. Магу тыдзень плакаць, пакутаваць, перажываць. Бывае і такое: калі нехта мяне пакрыўдзіў, я перапакутую, а потым выкрэсліваю гэтага чалавека са свайго жыцця. Калі ў мяне накапіўся негатыў, я ўжо не магу ўспрымаць чалавека, не цярплю, калі ён да мяне дакранаецца, стаіць побач. Праз нейкі час я ўнутрана дарую ўсім, хто некалі мне прычыніў боль, хоць болей не падтрымліваю стасункаў. Да такіх высноў мяне падштурхнулі ўсе.

АСЭНСАВАНЫЯ ЭПІЗОДЫ

— Для вас важна адчуванне ўнутранай свабоды?

— Вельмі важна. Насамрэч нейкі час я змагаюся — нават сама з сабой. Але калі адчуваю, што вычарпала сябе ў нечым, ці мяне нешта напружвае, то магу ўстаць і сысці. Я настолькі прывыкла ўставаць і сыходзіць, што ў мяне няма шкадавання з-за гэтага.

Вось я некалі сышла з праекта «Раніца». Я разумела, што за чатыры сезоны я вычарпала сябе ў гэтым праекце СТБ. Быў яшчэ «Дзённік жанчыны» — і таксама здарыўся момант, калі я адчула, што ён мне не патрэбны. З'явілася ток-шоу на БТ — я быццам бы чакала яго ўнутрана. Заўсёды, калі ад нечага адмаўляешся, то жыццё прапануе магчымасці пачаць нешта новае.

— Такая магчымасць будзе ў мюзікле «Байкер», дзе ў вас будзе галоўная роля. Чым зацікавіла гэтая праца?

— Роля Ірыны адрозніваецца ад іншых маіх роляў. Яна душэўная. Такая, якая, у прынцыпе, я ёсць у жыцці. Мне часта даюць іграць ролі, якія не адпавядаюць мне і маёй унутранай прыродзе, майму разуменню свету, але я ўжо ўмею іх добра выконваць. Нягодніц я іграю проста на раз-два-тры... Але разуменне любові і сэнсу жыцця ў мяне такое, як у Ірыны. Для мяне каханне — гэта святое слова.

— Ваша гераіня памірае з-за няшчаснага кахання. А як вы лічыце, чаму часцей менавіта жанчыны пакутуюць з-за кахання?

— У мюзікле мы абое паміраем. Спачатку я, а потым — ён. Вядома ж, гэта мастацкі твор і можна казаць, што ў сённяшнім жыцці ўсё інакш. Мужчыны іншыя... Напэўна, па-іншаму працуе іх арганізм. Нельга іх вінаваціць у тым, што яны не так адкрыта праяўляюць свае эмоцыі. Я не маю права вінаваціць — у самой сын расце. Я імкнуся вырасціць з яго, як мне здаецца, сапраўднага мужчыну. Мужчына, на мой погляд, павінен быць разумным. Разумнейшым за жанчыну. Адказным. І шчодрым. Не столькі ў сэнсе дарагіх падарункаў, хоць і гэта важны момант, калі ён не шкадуе нічога для каханай. Я маю на ўвазе іншую шчодрасць — у нейкіх душэўных праявах: і падтрымаць, і слова добрае сказаць. Тады жанчынам паміраць не трэба будзе.

— З такімі думкамі трэба рабіць ток-шоу для мужчын — каб яны лепш разумелі жанчын...

— Я часам чую, маўляў, тваё шоу для хатніх гаспадынь. Але высветлілася, што многія мужчыны глядзяць «Жыццё як жыццё»! Палова гасцей у нас — мужчыны. І ў зале палова мужчын. Мяне гэта здзіўляе. Насамрэч не заўсёды і не ўсе тэмы кранаюць і хвалююць асабіста мяне. А ёсць тэмы вельмі важныя, якія хвалююць не толькі жанчын, але і мужчын, таму што шмат што ў жаночым свеце залежыць менавіта ад іх. У нас шоу атрымліваецца «інтэрнацыянальнае», а мы па інерцыі яго называем жаночым.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

З Верай у сэрцы

А на мой погляд...

«ТЫЯ ПЕСНІ — СІМВАЛ ЦЭЛАЙ ЭПОХІ»

Якія рэвалюцыйныя песні вы памятаеце з дзяцінства: па кінафільмах на гэту тэму, з удзелу ў колішніх святочных дэманстрацыях? Якія асацыяцыі яны ў вас выклікаюць цяпер?

Ганна СОБАЛЬ, начальнік паштовага аддзялення сувязі «Заслаўе-1»:

— «Узвійцеся кастрамі, сінія ночы», «Тачанка-растаўчанка», «На пазіцыю дзяўчына...» і іншыя. Пра тыя часы ўспаміны сапраўды вельмі светлыя, але, хутчэй, як згадванне пра дзяцінства, юнацтва. Магчыма, у людзей больш сталых пры гучанні гэтых песень цяпер і ўзнікаюць нейкія настальгічныя ноткі, звязаныя з колішнімі падзеямі, а што да мяне... На пачатак лістапада прыпадалі школьныя канікулы, па тэлебачанні абавязкова паказвалі парад... Не ведаю як у горадзе, але ў вёсцы (а мае бацькі адтуль) у гэты дзень асабліва нічога не святкавалі, не было такой традыцыі. Ды і якія былі выхадныя дні ў людзей, што мелі гаспадарку? Так, усё гэта было даўно... Цяпер мы тыя песні практычна ніколі ўжо не спяваем.

Васіль ЖУК, намеснік галоўнага канструктара па серыйнай вытворчасці Мінскага трактарнага завода:

— Складанае пытанне. Я маю на ўвазе, калі ўвогуле гаварыць пра тыя падзеі... Якія б меркаванні ні выказваліся, усю праўду да канца ўсё роўна не скажаш, бо ёсць розныя версіі. Хоць гэта сапраўды была памятная вяха, узрушэнне і абысці бокам тыя падзеі нельга. У многім дзякуючы ім Беларусь стала суверэннай незалежнай дзяржавай, таму 7 лістапада — не шараговы дзень. Я вырас пад тымі лозунгамі, тымі, як вы кажаце, песнямі. Паколькі не з'яўляюся знаўцай музыкі, іх вось так адразу не прыгадаю, але памятаю, што спявалі і пра Кастрычнік, і пра Леніна. Але ніякай настальгіі ў мяне няма. Трэба жыць днём сённяшнім, крочыць у будучыню, але памятаць пра ўрокі гісторыі, якой бы супярэчлівай яна ні здавалася. Вось сёння шмат гавораць пра фільм «Адмірал». Я стужку пакуль не бачыў, але думаю, што ў любым выпадку нельга адназначна сцвярджаць: усё было добра альбо ўсё было дрэнна. Нават сённяшні час у розных людзей можа выклікаць розныя меркаванні, але нейкія высновы адносна яго, думаю, больш правільна будзе зрабіць значна пазней.

Наталля АЎЛАСЕНКА, старшы інспектар групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Першамайскага РУУС г. Мінска:

— Нават сказаць нічога не магу... Колішнія фільмы гляджу, некаторыя падабаюцца. Але нейкіх асацыяцый яны, ды і песні, што ў іх гучаць, на жаль, не выклікаюць. Хоць, напрыклад, «Няўлоўныя мсціўцы», падабаюцца, мы глядзім фільм усёй сям'ёй.

Вольга ШАЛАБНЁВА, метадыст па працы з дзецьмі і моладдзю Чэрвеньскага раённага цэнтра культуры і вольнага часу:

— А можна я напачатку выкажу сваё стаўленне да тых падзей? Яны недастаткова станоўчыя, скажам так, хоць і рэзка адмоўнымі я іх таксама не назаву. Аказваўся ціск, усталёўвалася штучная роўнасць... Песні дакладна не назаву, памятаю нешта пра «далоў буржуяў»... Калі вучылася ў тэхнічнай ВНУ, мне, вядома ж, даводзілася здаваць — і здаваць на станоўчыя адзнакі — палітэканомію, навуковы атэізм. Трэба памятаць той час, калі нельга было выказваць адкрыта сваё меркаванне. Тыя прадметы я цяпер не падтрымліваю і не хацела б вучыць ім моладзь. За навуковы атэізм я пакаялася ўжо і не адзін раз, можаце так і напісаць. Дарэчы, а якое ваша меркаванне?

Ірына САМУСЕНКА, навуковы супрацоўнік лабараторыі арніталогіі Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах:

— (*Смяецца.*) «Камсамольцы-добравольцы», песня пра героя грамадзянскай вайны Шчорса... Калі вы мне дасце хвілін пяць, я прыгадаю пяць-сем песень. Асацыяцыі? Добрая маршавая музыка. Калі ўвогуле пра падзеі, дык у мяне нармальнае стаўленне, яно не змянілася з тых ранейшых часоў. Гэта вяха ў жыцці цэлых народаў, яна ўсё роўна застанецца ў гісторыі. І песні — сімвал той эпохі, у іх спадзяванні, мары, настрой людзей тых часоў.

Аляксандр ГАЛКО, начальнік аддзела нравазнаўства Вілейскага аўтапарка № 5:

— «Інтэрнацыянал», «Не развітаюся з камсамолам»... Ды я ўсе песні тых часоў памятаю! Я вырас у Савецкім Саюзе, у ім прайшлі маё дзяцінства, юнацтва, служба ў Савецкай Арміі. Таму песні, вядома ж, выклікаюць асацыяцыі: цёплыя, часам настальгічныя. У свой час я ўзначальваў камсамольскую арганізацыю аўтапарка, нядаўна вось нас, колішніх сакратароў, запрашалі на святкаванне юбілею камсамола. Прыемна прыгадаць той час — гэта я вам шчыра, ад душы, сказаў.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

«Колісь рэвалюцыю МЫ зрабілі, цяпер рэвалюцыя робіць НАС!»

8 лістапада споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння пісьменніка Міхася Багуна

Лёс Міхася Багуна (сапраўднае прозвішча Блошкін Міхаіл Фёдаравіч) мала чым адрозніваецца ад лёсаў дзясяткаў, соцень яго равеснікаў — таленавітых творцаў.

Жыццёвы шлях Багуна быў кароткім — усяго няпоўных 30 гадоў... У 1936 годзе ён быў рэпрэсаваны, сасланы ў Сібір, памёр у лютым 1938-га.

Рэабілітаваны ў 1954 годзе.

Міхась Багун скончыў курсы пры Мінскім педагагічным тэхнікуме ў 1928-м, настаўнічаў. З 1931 года працаваў у газеце «Чырвоная Полаччына», з 1932-га — у Дзяржаўным выдавецтве БССР і газеце «Літаратура і мастацтва».

Друкавацца пачаў у 1925 годзе. Гэта быў, як цяпер сказалі б, рамантычна-пафасны паэт-трыбун. У вершах ён сцвярджаў сваю адданасць рэвалюцыйным пераўтварэнням:

Будуем харомы
бліскучаму дню —
адзінай сусветнай краіне,
і нашую радасць
не могуць сагнуць
ні буры, ні ветры, ні стыні!

Ён і ўявіць не мог, ШТО сагне яго радасць і пагубіць ягонае жыццё...

Сучасныя даследчыкі-літаратуразнаўцы адзначаюць, што Багун паслядоўна ўвасобіў усе асноўныя прынцыпы рэвалюцыйнага канцэптуалізму. Матыў супрацьпастаўлення старога і новага шырока разгорнуты ім у сюжэтна-ілюстрацыйнай паэме «Над балотам», дзе ў якасці прыкладу дабратворных рэвалюцыйных перамен выводзіцца вёска з сімвалічнаю назваю «Гніль», якую «завірухі, пажары краіны... не кранулі саўсім». Але ўрэшце перамены адбыліся, і вёска стала называцца «Новая доля». Рэвалюцыйны эпатаж праявіў М. Багун у творы «Крокі ў вякох: паэма без героя» (1930). Эпіграф красамоўна сведчыў пра пазіцыю аўтара: «Колісь рэвалюцыю МЫ зрабілі, цяпер рэвалюцыя робіць НАС!»

Гадаванец рэвалюцыі, Багун ці не наўмысна імкнуўся да лозунгавасці. «Я выкінуў з сэрца трывогі труп, пакрыты, як коўдрай, лірычнай карою... І зараз не песню, а лозунг вастру...»

Міхась Багун любіў творчасць Уладзіміра Маякоўскага, некаторыя вершы напісаны ім непасрэдна пад уплывам геніяльнага рускага паэта.

Я
сваю
пяцігодку —
на стол
і ў сэрцы
такая
шалёная
бура
быць пралетарскім
на ўсе,
на сто,
ці —
пакінуць
літаратуру.

Міхась Багун пісаў таксама апавяданні для дзяцей, пераклаў на беларускую мову шэраг раманаў, у тым ліку раман Мікалая Астроўскага «Як гартавалася сталь», асобныя вершы Пушкіна, Маякоўскага, Багрыцкага.

Яго талент мог бы расці і мацнець разам з ім — калі б не...

Таццяна ПАДАЛЯК.

Міхась БАГУН

Растраслі старыя клёны...

Растраслі старыя клёны
Ночы чорную кару,
На блакітныя загоны
Хтосьці выкінуў зару.

Сонцам роджанае ранне
Выбягае на палі,
На закінутай паляне
Нехта золата разліў...

Жыць так хораша на свеце!
Жыць без суму і тугі!
Малады бадзяка-вецер
Грае сонцу ціхі гімн...

І ў душы грымяць акорды
Ды на розныя лады:
Я сабой і сонцам горды
І, як ранне, малады!

Пахам іскрыстага рання
Я абмыю юны твар,
На красуючай паляне
Выпʼю радасць хараства.

І пайду назад дадому
Праз расквечаную гаць,
Каб другой або другому
Свежасць рання перадаць.

1928

Вясновы эскіз

Пахнуць далі
бярозавым сокам,
Чарназёмнаю пахнуць вясной.
На палях — не акінулі вокам —
Закурыўся растрэсены гной.

Па-знаёмаму вечар гарэзны
Па-над борам цалуе зару,
І махае бялявы бярэзнік
Павуцінаю зялёных рук.

Вольхі новай набраклі сілай
Над талеркай азёрнай вады,
Млын стары,
па-старому мілы,
Хоча стаць, як і я, маладым.

Дажывай свае дні, старэча,
Захлынайся ў жытнёвай крыві,
Камсамольцы з песняй
пад вечар
У калгас прывязуць паравік!..

1928

Шык-шок

ШМАТ ЛЁНУ І КРЫХУ... ЗЕФІРУ

Фота БЕЛТА.

У межах Тыдня моды Беларусі прайшоў фестываль «Лён-2008» — трэці, прысвечаны расліне і матэрыялу, ад якога млеюць за мяжой і які, бадай, толькі пачынае браць у палон радзіму. Ва ўсякім разе, новы брэнд Цэнтра Моды — «Галерэя лёну» карыстаецца ўсё большым попытам і ў беларусаў.

Падобныя фестывалі не проста паказваюць, на што здатныя нашы крэатыўныя дызайнеры, але і маюць цалкам меркантыльную мэту — насыціць рынак натуральным, стыльным айчынным адзеннем. Дзеля чаго галоўны рэалізатар дызайнерскіх фантазій — Аршанскі льнокамбінат — з зайздроснай рэгулярнасцю рэарганізуе вытворчасць, набывае новае абсталяванне.

Дваццатка калекцый дызайнераў самых розных айчынных прадпрыемстваў прадэманстравала на фестывалі неверагодна прывабны лён. Паверце на слова.

Лён можа быць да месца і там, дзе жывуць на паказ, з размахам, скажам, у вандроўцы на яхце або на вечарынцы ў прыстойным загарадным доме. Таму што гэта можа быць лён з бляскам, таму што ён можа быць не толькі мешкаватым і пакамечаным, але здольны падкрэсліваць тонкую талію, не псаваць прыгажосць аголеных плячэй і ног, і нават прагне стаць шлейфам у доўгай вячэрняй сукенцы. Лён — гэта лёгкія фарбы і дарослыя сілуэты для «miss sixty», што абавязкова зрывае бурную авацыю ў дарослых гледачоў.

Вядучы дызайнер Цэнтра Моды Эльвіра Жвікава паказала, што лён можа быць мяккім і незаменным падчас любых вандровак і даследаванняў. Вось такая куртка, туніка, камбінезон з кароткімі шортамі, сукенка-бутон, кашуля з кішэнямі, штаны не будуць лішнімі ў гардэробе кожнай жанчыны — незалежна ад узросту і камплекцыі. Мужчыны ж не павінны ўстаяць перад двухбаковымі пінжакамі. Эканомія, аднак: дзве рэчы ў адной!

Марыя Ніцэвіч запэўніла публіку, што старадаўні матэрыял станоўча разглядае магчымасці выкарыстання арнаменту, пазбаўленне сукенак рукавоў, а касцюмаў — аб'ёму (так, лён можа быць «у абліпку»).

Элегантныя, строгія і адначасова жыццярадасныя і легкадумныя касцюмы для мужчын ад Людмілы Тараканавай і Наталлі Куліковай (РУП «Навагрудская швейная фабрыка») уражваюць нечаканымі для лёну ўвогуле і для мужчын у прыватнасці колерамі — ярка-аранжавым або класічна блакітным, і ўвогуле задавольваюць настальгію па 70-х.

Эластычны, экалагічны, не выключае разнастайных камбінацый і спалучэнняў, шматслойны, любога колеру — ружовага, ліловага, ізумруднага, сапфіравага, аліўкавага, бэзавага, нават чорнага... Усё гэта яго Вялікасць лён! А хто б мог падумаць, што ён дазваляе вырабляць з сябе цалкам класічныя спартыўныя касцюмы, гледзячы на якія ну проста немагчыма сказаць, з чаго ўсё гэта.

Алена Леановіч (ЗАТ «Вяснянка», г. Магілёў) са сваёй калекцыяй «Зефір» абавязкова павінна трапіць у гісторыю, галерэю, а яшчэ лепш — у нашы шафы. Празрыстыя белы, ружовы, цёмна-карычневы колеры... Капелюшы, аборкі, валаны, кішэні, хвалі ўтвараюць такую смачную шматслойнасць, што кожную мадэль хочацца... панадкусваць. Выбачайце, люблю я, шаноўныя, зефір і лён! Над чым і вам жадаю паразважаць: лепшага спалучэння для апантаных здаровым ладам жыцця не прыдумаць. Як зефір праслаўлены сваімі пекцінамі, так лён — высокай гігіенічнасцю, трываласцю, камфортам, што дапамагае інтэнсіўнаму кровазвароту, стымуляванню арганізма і змяншэнню стомленасці. Медыкі нават лічаць, што лён спрыяе зніжэнню прастудных захворванняў.

Святлана БАРЫСЕНКА.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ПРА ЛЮБОЎ ГЛЕДАЧОЎ ДА «ГАСТРАЛЁРАЎ». ЗАДОРАГА

Апошнім часам на старонках «Звязды» друкаваліся нараканні чытачоў — лісты, тэлефонныя званкі — адносна дарагоўлі білетаў на канцэрты заезджых «зорак». Са спасылкай на спецыялістаў, якія маюць дачыненне да арганізацыі гастроляў апошніх, мы, у прыватнасці, тлумачылі чаму ж так адбываецца. Калі коратка нагадаць: цану на білеты фарміруюць рынкавыя адносіны. Але тое былі адзінкавыя пытанні і меркаванні чытачоў, прынамсі, апублікаваныя. Між тым, як аказалася, такой жа пазіцыі прытрымліваецца яшчэ шмат людзей...

Праведзенае Мінскім навукова-даследчым інстытутам сацыяльна-эканамічных праблем апытанне сярод гараджан засведчыла нізкую цікавасць з боку апошніх да гастрольных мерапрыемстваў. Як сведчаць вынікі даследавання, дастаткова часта іх наведваюць толькі 8,6 працэнта рэспандэнтаў, а цэнавая даступнасць гастрольных спектакляў і канцэртаў задавальняе ўсяго толькі 7,3 працэнта апытаных. Гэта адна з галоўных прычын такога становішча.

Каля трэці рэспандэнтаў заявілі, што падобныя мерапрыемствы для іх з'яўляюцца недаступнымі. Яшчэ амаль 60 працэнтаў мінчан адказалі, што ўсё залежыць ад канкрэтнага калектыву ці артыста. Пра цэнавую недаступнасць гастрольных мерапрыемстваў, дарэчы, часцей гаварылі людзі старэйшых узроставых груп і жанчыны.

Цяжка гаварыць аб музычных густах сталічнага жыхара, яго захапленнях класічнай, народнай або сучаснай музыкай, бо статыстыка тут адсутнічае. Канцэрты рок-выканаўцаў ва ўсім свеце збіраюць самыя вялікія аўдыторыі і прыносяць самыя вялікія прыбыткі. Як вядома, моладзь больш захапляецца сучаснай рок-музыкай. І тут без статыстыкі можна адзначыць некаторыя праблемы, што існуюць, гавораць даследчыкі. У Беларусь не возяць вядомых выканаўцаў, якія знаходзяцца на піку папулярнасці, па прычыне таго, што мэтавая аўдыторыя не зможа пакрыць выдаткі па арганізацыі канцэрта (ганарар выканаўцу, падаткі, іншыя выдаткі і закладзены прыбытак).

У Расіі канцэрты такіх выканаўцаў (Масква, Санкт-Пецярбург, Новасібірск) праводзяцца. Гэта тлумачыцца шэрагам прычын: ад больш высокага ўзроўню заробкаў у гэтых гарадах, больш прыцягальнай падатковай сістэмы да фінансавай іх «разгрузкі» за кошт рэкламы ці спонсарскіх грошай і г.д. У Мінску ж слаба выкарыстоўваецца фінансавая падтрымка масавых культурных мерапрыемстваў за кошт буйных рэкламадаўцаў. Хоць ёсць і станоўчыя прыклады — рок-фестываль у Сілічах і «Вечары музыкі» ў Мірскім замку.

Канцэртныя праекты класічнай музыкі праводзяцца больш часта, бо для гэтага маюцца адпаведныя «пляцоўкі», але дыяпазон коштаў змяншае магчымасць наведвання такіх мерапрыемстваў. Ніжняя планка цаны білетаў на канцэрты вядомых выканаўцаў вагаецца на ўзроўні 70—90 тысяч рублёў, што перавышае магчымасці сярэдняй сям'і схадзіць на такі канцэрт.

А вось сярод тэатралаў значную частку складаюць найперш жанчыны і гараджане старэйшых узроставых груп. У Мінску працуюць 12 тэатраў. Найбольш часта гараджане наведваюць Беларускі нацыянальны тэатр імя Янкі Купалы, Маладзёжны тэатр, Тэатр беларускай драматургіі, Тэатр кінаакцёра.

Як форма баўлення вольнага часу тэатр прыцягвае значную колькасць жыхароў сталіцы — больш за дзве трэці рэспандэнтаў. З гэтай колькасці дастаткова часта бываюць у тэатры 13,5 працэнта апытаных, а яшчэ 63,3 працэнта наведваюць прадстаўленні час ад часу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Острошицко-Городокского сельского исполнительного комитета Минского района

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка общей площадью 0,1113 га в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Новоселки Минского района. Кадастровый номер 623685205101000203. Начальная цена – 20 000 000 бел.рублей. Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы в сумме 720 996 рублей, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **09.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества, обращенного в доход Республики Беларусь:

Лот № 1 – квартира № 25 и квартира № 26 (объединенные в одну квартиру общей площадью 153,5 м. кв., жилой площадью 108,1 м. кв.), расположенные по адресу: г. Минск, проспект Независимости, д. № 76а. Начальная цена – 561 718 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о регистрации (для юридических лиц); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 56 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **21 ноября 2008 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **19 ноября 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36.

УНП 190398583

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже конфискованного имущества: двухкомнатная квартира № 127, расположенная по адресу: г. Минск, проспект Машерова, д. 76 (общая площадь – 46,9 кв. м, жилая площадь – 26,8 кв. м).

Начальная цена 191 819 420 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 19 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **21 ноября 2008 года** в 12.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **19 ноября 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36.

УНП 190398583

55 тысяч безбілетнікаў аштрафавалі рэвізоры ў Мінску за дзевяць месяцаў 2008 года. Улічваючы, што наземны транспарт штодзень перавозіць каля 1200000 чалавек, а ў месяц рэвізорам трапляецца прыкладна 6 тысяч грамадзян, якія не аплацілі праезд, то колькасць безбілетнікаў у агульным пасажырапатоку складае 0,016 працэнта.

З Верай У СЭРЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— Ці былі выпадкі, калі людзі дзякавалі за тое, што ім перадача дапамагла вырашыць рэальную праблему?

— Нам пастаянна і тэлефануюць, і пішуць. Бываюць лісты, на якія нават невядома як адказаць: людзі кажуць, што няма куды звярнуцца па разуменне, і выліваюць усё сваё жыццё, расказваюць сваю гісторыю. Але ў нашага народа менталітэт своеасаблівы: у кадр выцягнуць складана, як і прымусіць гаварыць перад камерамі. Толькі моцныя і смелыя людзі могуць прыйсці і распавесці пра сваю бяду адкрыта. Ці тыя, якіх сапраўды дапякло. У рынцыпе, я стварыла б нейкі форум у працяг праграмы, дзе людзі маглі б напісаць пра ўсё, што іх хвалюе, абмяркоўваць розныя тэмы з асабістага жыцця, дапамагалі б адзін аднаму парадамі. А мы б ім імгненна маглі адказаць: вось Вера Палякова лічыць так. І дзеля гэтага працавала б нейкая група, дзе былі б вельмі тонкія душэўныя людзі. У нас лістоў шмат і, на жаль, у мяне няма часу на іх адказаць — не магу гэта рабіць за кошт часу, які прысвячаю сваёй сям'і, свайму дзіцяці. Для мяне, як вядучай праграмы, якая звяртаецца да сямейных пытанняў, менавіта сям'я стаіць на першым месцы.

— А вы ў складаных сітуацыях да каго часцей звяртаецеся па парады?

— Да мужа.

— А да бацькоў? Да мамы?

— Ёсць моманты, калі я звяртаюся да мамы. Не магу сказаць, што зусім ніколі. Але ўсё-такі я дарослы чалавек. І цяпер больш раюся з мужам.

— А як жа сяброўкі?

— Так, ёсць сяброўкі, якім я даверяю, якія заўсёды скажуць праўду. Мне з імі няма чаго дзяліць, таму што ўсе сцвердзіліся як асобы. Паміж намі няма моманту саперніцтва. Усе маем сяброўкі разумныя жанчыны. І ўвогуле стасункі з дарослымі самадастатковымі людзьмі для мяне —

КАШТОЎНЫЯ ІМГНЕННІ

— Але ж не кожнай жанчыне скажуць, што яна «падобная на Сафі Марсо»…

— Так, у фільме «Эскіз на маніторы» была фраза: «А мне заўсёды казалі, што я падобная на Сафі Марсо. Вы не знаходзіце?..» І там так знята, што сапраўды ёсць падабенства. Асабліва калі ў мяне была кароткая стрыжка пад хлопчыка — Сафі Марсо з «Бума»! А ўвогуле я падобная на ўсіх — і ні на каго ў прыватнасці. Мне казалі, што ў адным спектаклі я падобная на Клаўдзію Кардынале, у іншым — на Веру Халодную…

— Як вы ставіцеся да параўнанняў?

— Гледзячы з кім параўноўваюць. Апошнім часам мяне параўноўваюць з Лалітай. Знешне мы абсалютна розныя. Магчыма — мой тэмперамент, аптымізм, патэнцыял да гэтага схіляе. Я заўсёды кажу «дзякуй» за такое параўнанне. Таму што яна вельмі таленавітая асоба. Што ні песня — хіт. Што ні выхад — бомба. І разумная.

— Вы таксама спяваеце. Акцёрскія спевы становяцца ўсё больш папулярнымі. Калі вы зразумелі, што можаце спяваць?

— Я з шасці гадоў займалася ў музычнай школе. Спявала ў хоры «Пралеска» — па піянерскіх часах ён быў вядомы. Была там нават салісткай. А потым ужо ішлі іншыя творчыя заняткі, танцы, напрыклад. Але патрапіла ў тэатральны ліцэй, калі мы пераехалі на новую кватэру. І так мяне тэатр захапіў, што я зразумела: хачу жыць на сцэне. Я ўдзячная педагогам у Акадэміі мастацтваў — у мяне была магчымасць спяваць і там. Калі заканчвала акадэмію, была ўжо на дзявятым месяцы цяжарнасці, а ўсё роўна выскоквала на сцэну, станавілася на крэсла, спявала арыю... Я спявала заўсёды. Проста толькі год таму ў мяне з'явілася магчымасць выпусціць сольны дыск песень у супрацоўніцтве з Сяргеем Сухамліным. Ёсць ужо і новыя песні, новыя задумы. Цяпер ён дапамагае мне працаваць над нумарамі ў мюзікле «Байкер». Але ёсць у мяне некалькі песень у супрацоўніцтве з іншымі кампазітарамі. Часта просяць праспяваць песню з фільма «Яшчэ пра вайну». Свае прызы на кінафестывалях я атрымала ў асноўным за працу ў гэтай карціне — за ролю другога плана.

— Фестывалі — гэта найперш новыя кантакты. Магчымасці супрацоўніцтва з рэжысёрамі з Расіі, напрыклад… Некаторыя вашы калегі іх скарысталі.

— Мне шмат разоў прапаноўвалі: трэба з'ездзіць у Маскву, паспрабаваць. Але мне ніколі не хацелася з'ехаць. Мне добра і ўтульна ў Беларусі. Ёсць магчымасць рэалізавацца тут і я веру, што іх будзе больш. Акрамя таго, разумею, што ўсе раз'езды-прыезды не адаб'юцца станоўча на маім асабістым жыцці, а яно для мяне самае галоўнае. Я павінна бачыць свайго сына. Мне неабходна пастаянна адчуваць блізкага чалавека, дыхаць ім. Гэта мая апора, маё натхненне. Толькі дзякуючы таму, што жыву ў стане кахання, я такая, як ёсць, і магу тварыць.

Размаўляла Ларыса ЦІМОШЫК.

У ВАС 75? А Ў НАС — 100!

Гурт «БЕЗ БІЛЕТА», прыдумаўшы аднойчы адмысловае свята — Дзень безбілетніка, актыўна адзначае яго штогод 7 лістапада. Сёлета святкаванне і тэматычны «безбілетны» канцэрт адбудуцца ўжо ў пяты раз. Затое ўпершыню трансляцыю гэтага канцэрта прыхільнікі з розных гарадоў і краін змогуць пачуць у інтэрнэце. Больш за тое, якраз 7 лістапада ў сеткі з'явіцца новы радыёканал, на 100 працэнтаў складзены з беларускай музыкі! Прычым, паводле слоў кіраўніка праекта NETradio Глеба Марозава, як і ў звычайным эфіры, «беларускасць» будзе галоўным фактарам. А вось «фарматнасць» — другасным: «нефарматам» тут будзе лічыцца якраз нехітрая поп-музыка, злепленая па законах эфірна-карпаратыўнага жанру», — адзначае праграмны дырэктар радыё Тамара Лісіцкая.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Ну і апетыт!

У Парагваі ўстаноўлены новы сусветны рэкорд па колькасці з'едзенага смажанага мяса на свежым паветры. У трапезе ўзялі ўдзел больш за 40 тыс. ахвотных, якія праглынулі 36 тон 141 кг смажанай ялавічыны, бараніны і свініны, што было з'едзена менш чым за 6 гадзін. Страву падавалі 6 тыс. добраахвотных афіцыянтаў. Прыкладна за 3 долары ўдзельнікі кулінарнай фіесты маглі з'есці столькі мяса, колькі ўлезе. Іх намаганні не прапалі дарэмна і былі афіцыйна занесеныя ў Кнігу рэкордаў. Дагэтуль рэкордам было спажыванне мяса ў колькасці 21 тоны 740 кг за 8 гадзін.

ПРОТОКОЛ

Настоящий составлен «29» октября 2008 года

Комиссией по проведению рекламной игры в составе:

Председатель комиссии Сидорович Владимир Николаевич, директор ОДО «Фулл Тайм».

Члены комиссии:

1. Хилько Елена Васильевна, главный бухгалтер ОДО «Фулл Тайм».
2. Дубовик Юлия Владимировна, заместитель главного бухгалтера ОДО «Фулл Тайм».
3. Догилева Татьяна Анатольевна, кассир ОДО «Фулл Тайм».
4. Орлович Юрий Васильевич, ИП Орлович Ю.В.

В том, что ОДО «Фулл Тайм» по адресу г. Минск, ул. Маяковского, 16 проведена рекламная игра «Улыбка на Миллион», зарегистрированная в Министерстве торговли РБ 20 августа 2008 года.

Победителями рекламной игры признаются:

Ф.И.О.	Паспортные данные (прописка)	Призовой фонд
1. Механиков Игорь Леонидович	МР 1565212, выдан Октябрьским РУВД г. Минска 01.07.2003 года;	Фотоаппарат SAMSUNG S830
2. Цыгалко Максим Владимирович	МР 2368543, выдан Ленинским РУВД г. Минска 26.12.2007 года;	Музыкальный центр SAMSUNG MM-X8Q/NWT
3. Козлова Екатерина Александровна	МР 1894512, выдан Заводским РУВД г. Минска 13.01.2004 года;	Телевизор SAMSUNG CS21Z47ZQ7X/NWT
4. Годес Алексей Олегович	МР1688205, выдан Ленинским РУВД г. Минска 23.12.2003 года;	Компьютер персональный Formoza INTEL D336/1024MB/ 80GB/FDD/SVGA in/ATX/Kbd/ Mouse/Pad; монитор Flatron L1718S BN 17ЖК

УНП 190475851

Доктор Алексей Алексеевич ХАДОРКИН:

при алкогольной, никотиновой, пищевой зависимости люди пытаются бороться со стрессом, употребляя спиртные напитки, сладкое, пищу, включающую жиры и муку, никотин. Это неправильно!
Если вы сами не можете отказаться от этих привычек, мы окажем психологическую помощь. Так же успешно лечатся псориаз и энурез у детей.

Запись на прием по телефону Минск 292 72 73

Лицензия МЗ РБ № 02040/0311208 от 27.10.2006 г. до 27.09.2011 г.

У МІНСКУ ЗМНЯШАЕЦЦА КОЛЬКАСЦЬ ХАТНІХ ЖЫВЁЛ

У апошнія гады ў сталіцы назіраецца тэндэнцыя да зніжэння колькасці хатніх жывёл. На 1 кастрычніка гэтага года ў дамах, якія знаходзяцца на тэхнічным абслугоўванні ЖРЭА раёнаў Мінска, зарэгістравана 12 923 сабакі. Для параўнання: у 2004 годзе налічвалася каля 17 тысяч сабак. Як паведаміла спецыяліст аддзела добраўпарадкавання, санітарнага стану і работы з насельніцтвам дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Раіса Кузняцова, большасць новых уладальнікаў своечасова рэгіструюць сваіх гадаванцаў.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск—Навіны».

ОАО «Белагропромбанк» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже гаражей, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 91:

№ лота	Номер гаража	Общая площадь (кв.м)	Начальная цена с НДС	Задаток от нач. цены
1	1 Б (с ямой)	28,3	30 198 560	10 %
2	3 Б	16,5	18 219 200	10 %
3	4 Б	16,3	18 967 320	10 %
4	5 Б	16,7	18 468 180	10 %
5	6 Б	16,6	18 219 200	10 %
6	7 Б	16,4	18 219 200	10 %
7	8 Б	15,7	17 220 920	10 %
8	9 Б	16,6	18 219 200	10 %

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Аукцион состоится **18 ноября 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17 ноября 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефоны: (8017) 224 61 34, 209 77 33.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания многофункционального, принадлежащего УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ» (металлический склад общей площадью 193,9 кв. м, инв. № 500/С-47118), расположенного по адресу: г. Минск, Партизанский проспект, 2.

Начальная цена – 386 783 000 белорусских рублей.

Отвод земельного участка будет осуществляться в установленном порядке Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 38 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **21 ноября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **19 ноября 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.

УНП 190398583

❐ Прадаецца дом 6 х 8, можна пад знос, у в. Галынь Навагрудскага раёна. Тэл.: 8 01597 71 479, 253 35 69.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

9 декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион

с применением метода понижения начальной цены по продаже объектов государственной собственности и права заключения договоров аренды земельных участков, составляющие единый предмет аукциона

На аукционные торги выставляются:

Сведения о капитальных строениях и их местонахождении. Продавец недвижимого имущества	Основные характеристики капитальных строений	Общая площадь, кв. м	Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества, га	Срок аренды земельного участка, лет	Начальная цена предмета аукциона (имущества/права заключения договора аренды земельного участка), руб.	Минимальная цена предмета аукциона (имущества/права заключения договора аренды земельного участка), руб.	Сумма задатка единого предмета аукциона, руб.
ЛОТ 1. Капитальное строение (клуб) (инв. № 640/С-21364), расположено по ул. Социалистической, 133 в г. Слуцке Минской области, (8 01795) 48 242. **РУП «1993-я центральная инженерная ремонтная база»**	Здание двухэтажное, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, полы дощатые, имеются: водопровод, канализация, электроосвещение, теплоснабжение, горячее водоснабжение, вентиляция, введено в эксплуатацию в 1933 году.	888,3	0,2389 **Арендодатель:** Слуцкий райисполком. Решением Слуцкого райисполкома от 05.03.2008 г. земельный участок изъят для обслуживания клуба. Ограничение в использовании участка, охранная зона канализационных коллекторов	51	174 019 347 (153 198 867 / 20 820 480)	143 380 480 (122 560 000 / 20 820 480)	15 000 000
ЛОТ 2. Капитальное строение (учебный корпус) (инв. № 640/С-21366), расположено по ул. Социалистической, 133 в г. Слуцке Минской области **РУП «1993-я центральная инженерная ремонтная база»,** (8 01795) 48 242	Здание двухэтажное, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, крыша совмещенная, полы дощатые, плиточные, ДСП. Имеются водопровод, канализация, электроосвещение, теплоснабжение и вентиляция, введено в эксплуатацию в 1933 году.	1131,8	0,4457 **Арендодатель:** Слуцкий райисполком. Решением Слуцкого райисполкома от 05.03.2008 г. земельный участок изъят для обслуживания учебного корпуса. Ограничение в использовании участка, охранная зона канализационных коллекторов	51	286 932 911 (248 082 041 / 38 850 870)	237 316 870 (198 466 000 / 38 850 870)	20 000 000
ЛОТ 3. Капитальное строение (профилакторий, включающий 4 пристройки, 2 склада, баню, 2 насосные, заправку, гараж, навес, теннисный зал) (инв. № 631/С-1306), расположено по ул. Стахановской, 221 в г. Вилейке Минской области, тел. (8 01771) 5 69 42. **ДУП «Автобусный парк № 5 «РУП «Миноблавтотранс»**	Фундамент бутовый ленточный, стены и перегородки кирпичные, крыша металлическая, полы цементные, инженерные коммуникации отсутствуют. Год постройки — 1968.	3187,9	0,8345 **Арендодатель:** Вилейский райисполком. Решением райисполкома от 31.10. 2008 г. № 1482 земельный участок изъят для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей	50	615 030 984 (583 644 271 / 31 386 713)	498 302 130 (466 915 417 / 31 386 713)	30 000 000
ЛОТ 4. Киоск торговый (инв. № 99). Охранно-пожарная сигнализация (инв. № 101), расположены по ул. Чернышевского, 11 в г. Барановичи, ЧУПУП «Барановичский оптрынок». (8 0162) 42 01 10, 23 44 06. **Брестское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация»**	Наружные стены — металлопрофиль, отделка внутренних поверхностей, стеклопакеты, роллеты защитные.	7,0	не выделен	—	10 006 582	2 001 316	800 000
ЛОТ 5.Здание химчистки-прачечной-котельной (инв. № 623/С-7851), расположенное по адресу: Минская область, г. Узда, ул. К. Маркса, 35. **Коммунальное унитарное предприятие «Узденский районный комбинат бытового обслуживания»**	Одноэтажное, фундамент — бутабетонный, стены и перегородки — кирпичные, перекрытия — железобетонные плиты, крыша — совмещенная рулонная, полы — плитка, дощатые, имеются инженерные коммуникации. Год постройки — 1977.	475,8	0,1185 **Арендодатель:** Узденский райисполком. Решением райисполкома от 15 июля 2008 г. № 867 земельный участок изъят для обслуживания здания	99	560 934 586 (555 470 255 / 5 464 331)	116 564 331 (111 100 000 / 5 464 331)	10 000 000

Порядок и сроки осмотра объектов оговариваются с продавцом.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

1. Соответствующий райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

2. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

3. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона не позднее 15 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 13 февраля 2007 г. № 77 и Указом Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 8 декабря 2008 г. до 13.00.

Royal

ОТЧЕТ О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Королевские подарки»

В период с 15 октября 2008 года по 30 октября 2008 года (включительно) в казино «Royal» проводилась рекламная игра «Королевские подарки». В игре участвовал 61 человек. В момент проведения рекламной игры изменения в правила проведения рекламной игры, состав комиссии по ее проведению не вносились.

В результате проведения розыгрыша призовой фонд в размере 84 600 000 (восемьдесят четыре миллиона шестьсот тысяч) белорусских рублей был разыгран в полном объеме.

Победители рекламной игры:

В **1-ом этапе** розыгрыша, который проводился 18 сентября 2008 года, денежный приз в размере 21 150 000 (двадцать один миллион сто пятьдесят тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 1 этапа рекламной игры, получил **Михолап Сергей Михайлович.**

Во **2-ом этапе** розыгрыша, который проводился 02 октября 2008 года, денежный приз в размере 21 150 000 (двадцать один миллион сто пятьдесят тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 2 этапа рекламной игры, получил **Бирюков Дмитрий Владимирович.**

В **3-ем этапе** розыгрыша, который проводился 16 октября 2008 года, денежный приз в размере 21 150 000 (двадцать один миллион сто пятьдесят тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 3 этапа рекламной игры, получил **Иванов Юрий Валерьевич.**

В **4-ом этапе** розыгрыша, который проводился 3 апреля 2008 года, денежный приз в размере 21 150 000 (двадцать один миллион сто пятьдесят тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 4 этапа рекламной игры, получила **Кочеткова Диана Дмитриевна.**

В период проведения рекламной игры стоимость условной единицы не менялась.

Организатором рекламной игры «Королевские подарки» являлось ООО «Дакарай». Правила проведения рекламной игры, состав комиссии по ее проведению, размер и состав призового фонда были зарегистрированы Министерством торговли Республики Беларусь – свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры № 1165 от 04 сентября 2008 года.

УНП 190617507

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 33 (283)

Не памыліцеся, купляючы саджанец

Восень — пара пасадкі пладовых дрэў. Але накіроўваючыся па саджанцы, мы часта не ведаем, як павінен выглядаць пасадачны матэрыял. Гэта дае магчымасць нядобрасумленнаму прадаўцу прапанаваць саджанец нізкай якасці. На што звярнуць увагу пры набыцці саджанца?

Выбіраючы саджанец, — гавораць спецыялісты — уважліва агледзьце яго зверху да нізу, асабліва карані. Каранёвая сістэма павінна быць добра развітая, мачкаватая, карані не падсушаныя. Здаровыя карані маюць на зрэзе светлую афарбоўку. Яшчэ лепш, калі на іх канцах ёсць белаватыя наплывы калюса. Гэта зачаткі маладых каранёчыкаў, іх трэба максімальна захаваць пры транспартаванні і, зразумела, не абрэзаць. Яшчэ трэба глядзець, каб было відаць месца прышчэпкі, каб на ствале саджанца не былі пашкоджаны пупышкі з якога-небудзь боку. Дзе няма пупышак, там не будзе і галінак, дрэўца будзе расці аднабокім.

Цяпер аб магчымых дэфектах пасадачнага матэрыялу.

У каранёў, якія падсохлі, кара зморшчаная, неэластычная, самі яны кволыя і ломкія. Падапрэлыя карані цёмныя, іх кара мяккая і лёгка аддзяляецца ад унутраных тканак. За зіму каранёвая сістэма можа добра захавацца, але ў яе маглі быць пашкоджанні з восені. Таму, купляючы дрэўца, звярніце ўвагу, ці няма раздзіраў паміж каранямі і ракавых наростаў («бародавак», якія падобныя на грэцкі арэх). Бывае, што дэфекты хаваюць, замазаўшы іх глінянай баўтушкай ды яшчэ з гноевай жыжкай. Перад пасадкай абмыйце карані. Калі яны без дэфектаў, то вам пашанцавала, а калі вас «надулі», то лепш выкінуць пасадачны матэрыял, чым траціць сілы ўпустую. Саджанцы з раздзірам выкідваць не спяшайцеся. Адмыйце карані, шчыльна звяжыце пянькой ці папяровым шпагатам разадраныя часткі. Параненая паверхня зарубцуецца, абрасце маладымі карэньчыкамі, а пянька ці шпагат перагніюць. Уважліва агледзьце і надземную частку. Кара павінна быць не зморшчанай, тыповага для гатунку колеру.

Ідучы купляць саджанец, прыхапіце з сабой анучку, плёнку і шпагат, бо на сонцы ды яшчэ з ветрыкам яны хутка засохнуць. Абгарніце дрэўца мокрай анучкай, загарніце ў плёнку і абкруціце шпагатам, зрабіўшы пучок з саджанцамі кампактным. У такім выглядзе іх можна некалькі дзён трымаць у халаднаватым месцы — карані не засохнуць, а пупышкі не распусцяцца.

Яшчэ не позна

«У нас не атрымалася пабяліць садовыя дрэвы ў пачатку восені. Ці не позна яшчэ гэта зрабіць цяпер або пакінуць на вясну?»

Сяргей ПАГОДЗЬКА, *Салігорскі раён.*

Некаторыя навічкі пабелку дрэў пакідаюць на вясну, відаць, каб дрэвы былі прыгожымі, стаялі ў садзе, нібы салдацкі, гатовыя несці баявую вахту ўвесь сезон. Але для таго, каб несці гэтую вахту, трэба перажыць стрэсавую пару — зіму — пачатак вясны. Вясной удзень сонейка шчодра прыгравае, а ўначы мароз таксама пастараўся. Дрэвы не гатовыя да такіх перападаў, а пад пабелкай кара не пераграецца. Калі ж ім не дапамагчы цяпер абараніцца ад шкоднікаў, сонечных апёкаў, потым вашы намаганні акажуцца марнымі. А менавіта пабелкай дрэў вы здымаеце некаторыя праблемы. Так што яшчэ ёсць магчымасць пабяліць дрэвы і гэта абавязкова трэба зрабіць.

Не забудзьцеся, што ў лістападзе...

- Трэба ўкрыць вінаград. Лозы звяжыце ў пучок, прыкрыйце яловымі галінкамі, зверху пакладзіце шыфер, пакінуўшы тарцы незакрытымі для доступу паветра.
- У кветніку працягвайце ўкрываць ружы, клематысы.
- Падсыпайце пілавінне, торф на ўчасткі з пасадкамі цыбульных кветак.
- Пасейце насенне шматгадовых кветак, а таксама аднагадовай астры пад зіму.

ШТО НАС ЧАКАЕ Ў 2012 ГОДЗЕ? 777

Канец дзён ці выхад на новыя гарызонты?

Продкі народа мая прыйшлі ў Паўднёвую Мексіку аднекуль з Поўначы, з боку легендарных Сініх пячор, чыё месцаразмяшчэнне дагэтуль невядомае. Яны прынеслі людзям каляндар, які адлічваў не толькі дні, тыдні і гады, але эпохі і цывілізацыі, што змяняюцца на нашай планеце. У гэтым свяшчэнным календары сказана, што 21 снежня 2012 года эпоха Чацвёртага Сонца, у якой жывём мы, закончыцца. Надыдзе Канец Дзён. Што хаваецца за гэтымі словамі?

АД РЫБАЎ ДА ВАДАЛЕЯ

Існуе па меншай меры тры трактоўкі таго, што можа адбыцца 21 снежня 2012 года. Першая сцвярджае, што менавіта ў гэты дзень збудуцца шматлікія прароцтвы і наступіць канец свету, апакаліпсіс. Некаторыя даследчыкі гавораць аб рэвалюцыі самой прыроды. Яны лічаць, што Зямля знішчыць нас, як паразітаў свайго цела. Адбудуцца катастрофы глабальнага маштабу: Зямля зменіць свой магнітны полюс, а Сонца павялічыць актыўнасць. Усё гэта прывядзе да значных змяненняў клімату: павелічэння колькасці землятрусаў, цунамі, вулканічнай актыўнасці.

Паводле другой версіі, мы, нарэшце, уступім у кантакт з цывілізацыямі прышэльцаў, з іншапланецянамі. Між іншым, гэтая версія сёння мае шмат прыхільнікаў.

Згодна з трэцяй трактоўкай прадказанняў мая, у снежні 2012 года чалавецтва выйдзе на якасна новы этап свайго развіцця. Магчыма, у нас разаўюцца неверагодныя здольнасці і таленты, якія дазволяць радыкальна перагледзець свой светапогляд. Прыхільнікі гэтай версіі перакананы, што трэба чакаць істотнага эвалюцыйнага скачку ў развіцці чалавека. На зменчалавеку разумнаму прыйдзе чалавек разумны міжпрасторавы — нам адкрыюцца новыя вымярэнні.

Самы вядомы прыхільнік і актыўны прапагандыст версіі перараджэння чалавека ў 2012 годзе — калумбійскі вучоны, астраном і фізік Фернанда Малькун. Ён сцвярджае, што зараз мы перажываем пераходны перыяд ад аднаго цыкла часу да іншага, ад эры цемры да эры святла, ад эры Рыбаў, чый дэвіз быў «Я веру!» да эры Вадалея — «Я ведаю!». Паводле слоў Малькуна, для чалавецтва 2012 год будзе пачаткам велізарнага прарыву ў галіне касмічнай інфармацыі. Мы ўпершыню дакранёмся да сакральных ведаў, якія на працягу многіх тысяч гадоў былі схаваныя ад нас. Сонечная сістэма атрымае з цэнтра галактыкі сінхранізуючы прамень, які пакладзе канец многім звыклым прадстаўленням чалавека і стане пачаткам нашай інтэграцыі з Сусветам, з касмічным розумам.

Усходнеславянскія народы знаходзяцца ў авангардзе новай расы. Славяне, якія характарызуюцца цэласнасцю мыслення, павінны аб'яднаць Захад і Усход і стварыць новую духоўную канцэпцыю, у якой спалучыцца навука, рэлігія і соцыум.

7 РАС, ЯК 7 КЛАСАЎ

Мы ўступаем у новую расу, і гэты пераход завершыцца менавіта ў 2012 годзе, перакананы кіраўнік аддзела па даследаванні працэсаў планетарнага сінтэзу Інстытута гуманітарных і экалагічных тэхналогій НАН Беларусі, філосаф Мікалай ПАНЧЫШЫН.

Паводле яго тэорыі, на нашай планеце па чарзе павінна з'явіцца 7 рас (мы — пятая раса), пасля чаго Зямля знікне (бо яе функцыя будзе завершана) і наноў народзіцца ў іншым месцы, у іншым вымярэнні. Што датычыцца нашай рэчаіснасці, то першапачаткова планета, уся матэрыя і людзі праявіліся з нябачнага духоўнага свету, свету ідэй, святла, Абсалюту.

— Пра першую расу мала што можна сказаць, — тлумачыць Мікалай Васільевіч. — Паводле паданняў, гэта была гіпербарэйская раса, якая жыла на Паўночным полюсе. Але яе прадстаўнікі мелі настолькі эфірныя тонкія целы, што не пакінулі ніякіх матэрыяльных слядоў свайго існавання. Тое ж датычыцца і другой расы. Увогуле, першыя дзве расы ў ізатэрычнай літаратуры лічацца таямнымі, пра іх нічога канкрэтнага сказаць нельга. Вядома, што чалавек тады быў цэласнай, адзінай манадай, без палавога падзелу і размнажаўся пачкаваннем. Свядомасць тагачасных людзей была блізкай да Абсалюту, а іх духоўныя патокі — вельмі магутнымі.

Трэцяй зямной расай сталі лемурыйцы. Яны першымі здолелі праявіцца ў канкрэтнай фізічнай абалонцы і на пачатку свайго існавання былі гермафрадытамі. І толькі ў сярэдзіне развіцця лемурыйскай цывілізацыі (паводле індыйскіх старажытных крыніц 18 млн гадоў таму) адбыўся падзел чалавека на мужчыну і жанчыну.

Паводле даследаванняў Панчышына, кожная новая раса была больш моцна «завязана» на матэрыі, і менш — на духоўнасці, хоць першапачаткова любая раса ствараліся ў святле. Ніжэй за ўсіх апусцілася да негатыўнага духоўнага полюсу чацвёртая раса — атлантаў. Іх цывілізацыя мела «гранічнае зазямленне» на эгаізме і загінула з-за чорнай магіі.

— У цывілізацыі атлантаў магія была шырока распаўсюджаная, — працягвае філосаф, — яе нават выкладалі ў школах. З дапамогай магіі атланты здзяйснялі дзіўныя неверагодныя рэчы. Аднак калі ў іх грамадстве пачаў дамінаваць эгаізм і злоўжыванне магіяй, яны загінулі. Менавіта таму ў арыйскай (нашай пятай) расе магічную літаратуру забаранялі і знішчалі, бо справядліва меркавалі, што атрымаўшы магчымасць, чалавецтва возьмецца за старое.

Кожная раса існавала мільёны гадоў, напрыклад, лемурыйцы былі сучаснікамі дыназаўраў. Паводле індыйскіх старажытных календароў, самы буйны востраў Атлантыды — Рут пагрузіўся пад ваду 850 тысяч гадоў таму. А апошні — Пасейдоніс, пра які пісаў Платон, знік у акіяне 11 тысяч гадоў таму. Па розных падліках арыйцы існуюць на Зямлі ўжо каля мільёна гадоў.

— Кожная раса — гэта прынцыпова новы падыход да чалавека, — тлумачыць Панчышын. — Так, лемурыйцы не валодалі нашай свядомасцю і ментальнасцю, але былі духоўна чыстымі. Потым з'явілася раздзяленне на дабро і зло, кожны чалавек зрабіў свой выбар, прайшоў духоўную «селекцыю». У чацвёртай расы — атлантаў — дамінавалі эмоцыі, пачуцці, якія былі ў іх выключна развітыя. Пятая раса — наша, грунтуецца на ментале, логіцы. А хутка мы пяройдзем у шостую, якая будзе вызначацца інтуіцыяй («пачуццём ведання»). У многіх дзяцей яно праяўляецца ўжо сёння, а ў шостай расе гэта будзе натуральнай якасцю кожнага чалавека. У адрозненне ад логікі інтуіцыя ўсё разумее адразу. Ёй не патрэбны доказы, каб выбраць правільнае рашэнне. Адзначу, што ўсходнеславянскія народы знаходзяцца ў авангардзе новай расы. Славяне, якія характарызуюцца цэласнасцю мыслення, павінны аб'яднаць Захад і Усход і стварыць новую духоўную канцэпцыю, у якой спалучыцца навука, рэлігія і соцыум. Расія, Украіна і Беларусь бяруць на сябе сусветную карму — менавіта таму жыццёвы шлях іх такі складаны. Іх гістарычная задача «пераварыць» увесь сусветны негатыў на пазітыў і нарадзіць новую парадыгму, адпрацаваць для чалавецтва новы кармічны калідор, шлях да новых магчымасцяў, да новай расы.

З пароцтваў мая: «У самым канцы Чацвёртага Сонца наступіць Эпоха Перамен. На Зямлі народзяцца дзеці Белага Ягуара. Яны будуць рознага колеру скуры і будуць жыць у розных кутках нашага свету. Менавіта яны вернуць людзей да любові, святла і старажытных каранёў».

ДЗЕЦІ БЕЛАГА ЯГУАРА

З пароцтваў мая: «У самым канцы Чацвёртага Сонца наступіць Эпоха Перамен. На Зямлі народзяцца дзеці Белага Ягуара. Яны будуць рознага колеру скуры і будуць жыць у розных кутках нашага свету. Менавіта яны вернуць людзей да любові, святла і старажытных каранёў».

Многія даследчыкі лічаць, што дзеці індзіга — гэта якраз тыя самыя белыя ягуары, прызваныя змяніць свет.

Як падрыхтавацца да прыходу новай эры? Умець жыць сённяшнім днём, у цесным кантакце з прыродай, у гармоніі і любові. Рабіць дабро, нікога не асуджаць, не скардзіцца, не слухаць чужых скаргаў і плётак.

2012 год не за гарамі. А вы — гатовы да пераходу ў новую расу?

Інга МІНДАЛЁВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.20	16.25	9.05
Віцебск —	7.14	16.11	8.57
Магілёў —	7.10	16.15	9.05
Гомель —	7.02	16.17	9.15
Гродна —	7.35	16.41	9.06
Брэст —	7.30	16.47	9.17

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Апанаса, Івана, Мікалая, Пятра.*
К. *Хрысціны, Леанарда, Фелікса.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

6 лістапада

Дзве даты

1933 год — у Мінску завершана будаўніцтва Дома ўрада, найбуйнейшага ў Беларусі збудавання грамадзянскай архітэктуры даваеннага часу. Архітэктар — Іосіф Лангбард. Будынак з'яўляецца помнікам архітэктуры рэспубліканскага значэння. Праз некалькі гадоў, у сувязі з тым, што планавалася перанесці сталіцу ў Магілёў, «клон» Дома ўрада быў узведзены і ў горадзе на Дняпры.

1928 год — палкоўнік Джэйкаб Шык запатэнтаваў электрычную брытву.

Цытата дня

«У каханні губляюць розум, і толькі ў шлюбе заўважаюць гэту страту».

Майсей Сафір (1795—1858), аўстрыйскі пісьменнік.

Усміхнёмся!

— Алё! Гэта «хуткая дапамога»? Тут чалавеку дрэнна!

— О, які прыемны голас! Што вы робіце сёння ўвечары?

☺

— Так, хлопцы, у нашай сакратаркі Марынкі прыбытак у сямействе. Усе здаём па пяць тысяч. І аналіз ДНК.

☺

Рыбак злавіў залатую рыбку:

— Ты вось што, давай маю жонку таксама ператвары ў залатую рыбку! Хай у акварыуме плавае моўчкі і ўсе мае жаданні выконвае.

☺

Прымета.

Галубы, якія ляцяць нізка над галавой, — да мыцця.

☺

— Я свайму мужу перад тым як еду ў водпуск, купляю круг вернасці.

— Цікава... І як гэта выглядае?

— Стаўлю мужа пасярэдзіне пакоя і абстаўляю яго бутэлькамі з гарэлкай. Пасля гэтага ён ні аб якіх бабах нават думаць не хоча.

— Дарагая, ты што там гатуеш з раніцы?

Дорогие **Алла Брониславовна** и **Вячеслав Войтехович ЩАНОВИЧИ!** Поздравляем вас с 40-летием совместной жизни.



Не старейте, милые родители,
Счастья вам, здоровья, долгих лет!
В вас всегда мы светлый образ видели,
Никого у нас роднее нет!
За тепло, за души ваши добрые
И за то, что вы растили нас,
За заботу и терпенье долгое
Пусть вам бог здоровья даст.

С любовью дети и внуки.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 19.11.2008 г.

Фонд «Минскгоримущество» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска

	Лот №	1
1	Наименование и местонахождение объекта, тип и характеристика помещения	Не завершенный строительством объект — «Магазин промышленных товаров в жилом доме № 2 по генплану со встроенными помещениями. Жилой район Дружба. Микрорайон Дружба-3 (1-я очередь строительства)»
2	Общая площадь* (кв.м)	1203,60
3	Начальная цена продажи (руб.)	1 700 000 000
4	Сумма задатка (руб.)	170 000 000
5	Сроки оплаты объекта	Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи
6	Характеристика строения	Фундаменты – сборные железобетонные; стены наружные – из блоков керамических крупноразмерных поризованных; стены внутренние – из кирпича КРПУ – 150/15/СТБ 1160-99; перегородки – из кирпича полнотелого КРПУ; перекрытие – плиты шифр 0-312; полы – бетонные, линолеум, керамическая неглазурованная плитка. Степень готовности объекта по состоянию на 01.05.2008 г. – 63 %
7	Условия продажи объекта	Сохранить функциональное назначение объекта. Возместить сверх цены продажи затраты в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимости дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих затрат, понесенных заказчиком (УП «УКС Мингорисполкома») по строительству объекта после даты оценки до даты подписания акта приема-передачи. Возместить сверх цены продажи затраты в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимости дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих работ по инженерным сетям, благоустройству и озеленению по состоянию на 01.05.2008 в сумме 214 703 270 руб. – по лоту № 1, проиндексированных на дату их перечисления по индексам изменения стоимости строительно-монтажных работ по элементам затрат по г. Минску по ресурсно-сметным нормам (для работ, не освобождаемых от налога на добавленную стоимость). Компенсировать УП «УКС Мингорисполкома» затраты по выплате земельного налога с момента принятия объекта по акту приема-передачи до оформления правоустанавливающих документов на земельный участок

* Сведения о площадях объектов, не завершенных строительством, даются на основании проектно-сметной документации.

1) Аукцион состоится **19 ноября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

2) Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность;

представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- представители юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе представитель юридического лица должен представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие его полномочия на участие в аукционе и на подписание документов:

- руководитель юридического лица – документ о его назначении или избрании, а при необходимости – документ о его полномочиях, согласно уставу юридического лица;

- иные представители – доверенность, оформленную согласно учредительным документам юридического лица.

Физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности, удостоверенной нотариально) должно представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

соглашение о правах и обязанностях сторон;

заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены;

б) платы за участие в аукционе в размере 4-х базовых величин. Денежные средства перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк», по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов по каждому лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится Покупателем.

Победитель аукциона обязан произвести оплату организатору аукциона за подготовку и проведение аукциона в размере 4 процентов от начальной цены продаваемого объекта и 5 процентов от суммы превышения цены продажи над начальной.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **18 ноября 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by

УНП 190398583

Крымінал, здарэнні

ВЫМАГАЛІ $34 000

Трое мінчан, якія сілком «выбівалі» грошы з індывідуальнага прадпрымальніка з Заслаўя, трапілі на «заметку» да праваахоўнікаў.

35-гадовага пацярпелага «прэсавалі» двое індывідуальных прадпрымальнікаў і непрацуючы. Вымагальнікі патрабавалі ад сваёй ахвяры значную суму — 34 тысячы долараў ЗША. Ды толькі перагнулі палку — у справу давялося ўмяшацца супрацоўнікам Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і спецпадраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз». Узбуджана крымінальная справа.

ЗБЕГЛІ І НАПРАКУДЗІЛІ

Па дапамогу да праваахоўнікаў звярнулася 71-гадовая вясковая бабуля, да якой вечарам у хату ўварваліся невядомыя злачынцы.

Крымінальны «дуэт» завітаў да пенсіянеркі з вёскі Крываконна, што ў Зэльвенскім раёне. Старая, да якой у хату а палове сёмай вечара нехта пастукаўся, адчыніла дзверы, аб чым потым пашкадавала. Двое мужчын звязалі жанчыну і яе мужа, а пасля таго, як адшукалі грошы — 1,5 мільёна рублёў і 40 долараў, а яшчэ 5 бутэлек спіртнога, зніклі.

Як высветлілі праваахоўнікі, злачынства ўчынілі трое асуджаных, якія адбываюць пакаранне ў папраўчай установе адкрытага тыпу і самавольна яе пакінулі. Злачынцы затрыманы.

Ігар ГРЫШЫН.

СМЕРЦЬ НА НЕБЯСПЕЧНЫМ ПЕРАХОДЗЕ

2 лістапада ў Магілёве на пешаходным пераходзе аўтамабіль збіў маладую жанчыну, якая праз некалькі гадзін памерла ў рэанімацыі.

Гэта трагічнае здарэнне адбылося позна ўвечары на вуліцы Крупскай насупраць каледжа міліцыі: 21-гадовую магіляўчанку збіў аўтамабіль «Сіят-Кардоба», якім кіраваў 23-гадовы жыхар вёскі Мяжысеткі Магілёўскага раёна. Жанчына атрымала цяжкія траўмы, у тым ліку і адкрытую чэрапна-мазгавую. Урачы змагаліся за яе жыццё, але без поспеху. Дарэчы, у гэты ж дзень, але некалькімі гадзінамі раней на тым жа пераходзе аўтамабіль наехаў на двух пешаходаў, якія атрымалі лёгкія траўмы. Вадзіцелям і пешаходам неабходна быць надзвычай уважлівымі і дбаць пра бяспеку позняй восенню: непрацяглы светлавы дзень і ранняя цемра, а таксама дажджы, туманы і замаразкі ўскладняюць сітуацыю на дарогах.

Алена КАЗЛОВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Наименование предмета аукциона	Здание конторы лесничества и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Кобринский р-н, д. Дивин, ул. Ленина, 65
Продавец недвижимого имущества	ГОЛХУ «Кобринский опытный лесхоз», г. Кобрин, ул. Советская, 79 тел. 801642 2 20 50, 2 74 77
Сведения о предмете аукциона	Здание конторы 1-этажное, фундамент кирпичный, перегородки деревянные, крыша шиферная, уборная, сарай, забор, площадь здания – 130,5 кв.м. Земельный участок площадью 0,2746 га, срок аренды – 50 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	4 940 247
Сумма задатка, руб.	494 000
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63 www. brest–region.by*

Аукцион состоится **9 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица.

4. Индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

7. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и расходы на подготовку и проведение аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 8 декабря 2008 года включительно.

ДЗМІТРЫЕЎ ДЗЕНЬ

8 лістапада — Дзмітрыеў дзень, Дзмітры, Змітрок, Зміцер — дзень ушанавання памерлых. Паўсюдна славяне ў гэты дзень наладжвалі памінкі па памерлых свяках.

● На працягу тыдня, на які прыпадаў Дзмітрыеў дзень, у храмах наладжвалі памінальныя набажэнствы (асабліва ўшаноўваецца Дзмітрыеўская субота). Па праваслаўным календары ў Дзмітрыеўскую суботу праводзяць агульнае памінанне, заснаванае вялікім князем Дзмітрыем Данскім, які атрымаў знакамітую перамогу ў 1380 годзе над Мамаем (Кулікоўская бітва). Па яго просьбе ў той год адбылася ўсяленская паніхіда аб усіх загінулых на полі бітвы.

● У Беларусі здавён існавала народнае правіла святкавання Дзмітрыеўскіх, ці Восеньскіх, Дзядоў у трэцюю суботу пасля Пакравоў. У некаторых рэгіёнах (напрыклад, Ашмянскім павеце) дарэвалюцыйныя этнографы засведчылі, што «першыя Дзяды адзначалі ў чацвер на Дзмітрыеўскім тыдні, другія — у суботу, трэція — у нядзелю, а чацвёртыя — у суботу перад Загавінамі (27.11.)».

● Дзмітрыеўскую, памінальную, бацькоўскую суботу заўсёды праводзілі ўрачыста: хадзілі на магілы сваякоў, служылі паніхіды, наладжвалі жалобныя сталы, дзе не абыходзілася без галашэнняў.

● У гэты дзень забаранялася выконваць усялякую цяжкую фізічную ці якую б там ні было «брудную» работу: «На Змітра не пралі, не ткалі і ў полі не працавалі».

● У гэты час на поўную хаду наладжваліся восеньскія вяселлі: «Святы Змітры — людзі хітры: чаны параць, піва вараць, сыноў жэняць, дачок даюць». Шуткавалі: «У Дзмітрыеў дзень і верабей пад кустом піва варыць».

● А яшчэ ў гэты дзень пільна назіралі за надвор'ем:

Калі «адпачнуць» на дзедавым тыдні бацькі (калі будзе цёпла), то і ўся зімушка-зіма будзе з мокрымі цеплінамі (адлігамі).

Калі Дзмітрыеў дзень будзе «па голу» (без снега), то і Вялікдзень будзе цёплым, а калі Дзмітрыева субота са снегам, то і Святая (Вялікдзень) са снегам.

Дзмітрый на снезе — вясна позняя.

Дзмітрыеў дзень — зіма ўжо лезе на пляцень.

Да Змітраўскай суботы зіма не пачнецца.

Калі на Дзмітрыя холад і снег, вясна позняя і халодная, а калі адлfigа — вясна і зіма цёплыя.

Зміцер зямлю выцер, на груды пабіў, каб ніхто не хадзіў.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

АДДЗЯЧЫЎ ЗА КАМПАНІЮ

У Століне выпівалі двое сабутыльнікаў, а пад канец застолля госць, наставіўшы нож на гаспадара, гвалтоўна адабраў 60000 рублёў. А потым прыхапіў яшчэ два пачкі цыгарэт і пайшоў сабе дадому, але неўзабаве быў затрыманы міліцыяй.

Яна СВЕТАВА.

«АКВАДЗІЎ» — НОВЫ АЙЧЫННЫ БРЭНД

На прадпрыемстве пад вядомай у нашай краіне і за яе межамі назвай «Аквадзіў» выпрацавалі сваю эфектыўную стратэгію і тактыку развіцця ва ўмовах рынкавай эканомікі, паспяхова рэалізавалі яе і ў выніку апынуліся ў лідарах сваёй галіны.





За прыгожыя вочы не даюць Гран-пры ў Сочы

Нядаўна ў Сочы, дзе праходзіла спецыялізаваная знакамітая міжнародная выстава-кірмаш, спірт этылавы рэктыкаваны «Эліта» з Малінаўшчызненскага спіртагарэлачнага завода «Аквадзіў» адзіны сярод мноства прадстаўленай аналагічнай прадукцыі, атрымаў Гран-пры.

За гэту вышэйшую, а таму, зразумела, галоўную ўзнагароду разгарнулася асабліва ўпартая барацьба. Каб толькі намінавацца ў Сочы на конкурс спіртавікоў, прадукт павінен мець у загашніку залаты медаль. Інакш кажучы, на Гран-пры маглі прэтэндаваць выключна «залатыя» лаўрэаты. Але перамога ў рэшце рэшт засталася за беларусамі. Ім таксама пашчасціла і ў іншых намінацыях.

Нагадаем, што ў выставе-кірмашы ўдзельнічалі амаль 300 прадпрыемстаў з розных краін. Сур'ёзна былі прадстаўлены Расія і Украіна — традыцыйныя канкурэнты беларускіх вытворцаў розных напояў, у тым ліку і моцных. Напрыклад, разлічваў на перамогу (і не без падстаў) такі раскручаны і ў Расіі ды і ў нас знакаміты ўкраінскі брэнд «Нямірaў». Тое, што «Аквадзіву» ўдалося пасунуць вядомых вытворцаў высакаякаснага спірту, стала ў пэўным сэнсе сенсацыяй выставы. Бо Гран-пры за прыгожыя вочы не даюць у Сочы, там даражаць маркай выставы-кірмашу.

Гран-пры ўжо працуе на карысць завода. Дзякуючы гэтай прэстыжнай узнагародзе павысіліся рэальныя шанцы на павелічэнне экспарту прадукцыі завода. Ужо ў мінулым кастрычніку яе першая 30-тонная партыя была пастаўлена за межы нашай краіны.

Адраджэнне традыцый

Гісторыя сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю (СТАА) «Малінаўшчызненскі спіртагарэлачны завод «Аквадзіў» нагадвае ператварэнне беднай правінцыйнай папялушкі ў бліскучую і заможную прыгажуню.

Праўда, ператварэнне гэта было паступовым, часам хваравітым і марудным, зусім не казачным — у адзін момант па руху чарадзейнай палачкі. Каб увайсці ў лік эканамічна моцных прадпрыемстваў і стаць, без перабольшвання, прамысловым брэндам у сваёй галіне, «Аквадзіву» спатрэбілася амаль дзесяць гадоў. Аб здабытках на гэтым няпростым шляху сведчаць і салідная дынаміка вытворчых паказчыкаў, і шматлікія ўзнагароды і дыпломы. Яны апошнім часам рэгулярна прысуджаюцца прадукцыі завода на розных міжнародных конкурсах і выставах. Адтуль ужо ў Малінаўшчызну прывезены дзясяткі медалёў і дыпломаў лаўрэатаў. Усе нават цяжка пералічыць. Назавём толькі некаторыя. Летась, напрыклад, прадукт «Аквадзіў Прэміум 1871» атрымаў медаль лаўрэата на выстаўцы-прэзентацыі «Беларуская якасць-2007» у Маскве. Для заваявання расійскага рынку прадуктаў харчавання і напояў — гэта сур'ёзная заяўка. Бо, як вядома, Масква задае тон на моду спажывання ва ўсёй Расіі.

Як і амаль два стагоддзі таму там зноў знаёмяцца з прадукцыяй завода з Малінаўшчызны. Нагадаем, у XIX стагоддзі пад патранатам прадстаўнікоў славутага шляхецкага роду Радзівілаў-Агінскіх непадалёк ад Маладзечна ў вёсцы Малінаўшчызна Вілейскага павета Віленскай губерні быў заснаваны невялікі завод. Ён выпускаў розныя якасныя моцныя напоі для тутэйшай шляхты і іншага насельніцтва, а потым і для экспартных патрэбаў тагачасных гаспадароў маёнтка. Да рэвалюцыі гэта

Генеральны дырэктар СТАА «Малінаўшчызненскі спіртагарэлачны завод — «Аквадзіў» Алег Леанідавіч РЫМАШЭЎСКІ.

прадукцыя карысталася вялікім попытам у царскай Расіі і за яе межамі, нават узнагароджвалася залатымі медалямі на прэстыжных міжнародных выставах.

Потым былі Першая сусветная вайна, рэвалюцыя, акупацыя панскай Польшчы, другая сусветная вайна... У віхуры трагічных падзей завод прыйшоў у поўны заняпад. Пасля вызвалення ад немцаў у Малінаўшчызне наладзілі прымітыўную вытворчасць спірту.

Развал СССР таксама хваравіта ўдарыў па прадпрыемстве. Заштатны дробны спіртзавод апынуўся ў аднолькава няпростым, мякка кажучы, становішчы разам з сотнямі іншых невялікіх беларускіх прадпрыемстваў, размешчаных у раённых цэнтрах, гарадскіх пасёлках і вялікіх вёсках. Яго новаму кіраўніцтву самастойна давялося вырашаць усе шматлікія праблемы выжывання.

Потым, асабліва пасля ўзначальвання яго Алегам Рымашэўскім, пачалася работа па выхадзе прадпрыемства на новыя рубяжы. Група энтузіястаў і спецыялістаў на чале з новым дырэктарам завода мэтанакіравана працавала над адраджэннем былых традыцый, вяртаннем да каранёў продкаў. Стаўку зрабілі на распрацоўку новых відаў прадукцыі. Іх перавагі былі бясспрэчнымі: гэта і якасць, і смак, і прыгожая бутэлька, і прымальная цана. Адпаведна расло і кола аптовых пакупнікоў прадукцыі «Аквадзіва». Цяпер іх сотні. З часам сталіца стала адным з асноўных спажыўцоў прадукцыі «Аквадзіва». Сёння ў Мінску прадаецца каля 60 працэнтаў яго вырабаў.

Акрамя Гран-пры сёлета ў Сочы яшчэ тры залатыя медалі былі прысуджаны наступным прадуктам завода: «Аквадзіў Губернатарская», бальзам «Аквадзіў» і мінеральная вада «Аквадзіў». Што і казаць, сапраўдны кошык прэстыжных узнагарод. Там жа ў Сочы сваю ўзнагароду атрымаў і генеральны дырэктар СТАА «Малінаўшчызненскі спіртагарэлачны завод — «Аквадзіў» Алег Леанідавіч Рымашэўскі. Яму ўручылі медаль «За грамотнае кіраўніцтва кампаніяй» і пасведчанне да яго. Дарэчы, адзінаму з дырэктараў беларускіх прадпрыемстваў, якія выставілі на конкурс у Сочы сваю прадукцыю. У лік узнагароджаных трапіла невялікая група дырэктараў прадпрыемстваў, прадукцыя якіх заваявала Гран-пры ў пэўнай намінацыі.

Не будзем курыць фіміам і складаць оды ў гонар генеральнага дырэктара «Аквадзіва», маўляў, узнагарода знайшла свайго героя. Але дзеля справядлівасці адзначым яго, без перабольшання вялікі ўклад у агульную справу і агульнае дасягненне калектыву завода. Бо за тыя амаль дзевяць гадоў, што Алег Леанідавіч стаіць на чале прадпрыемства, яно істотна прасунулася наперад у набыцці статусу новага беларускага брэнда.

Складнікі поспеху

У чым яго сакрэт? Калі быць лаканічным, то ён у няспынным развіцці прадпрыемства па ўсіх галоўных вытворчых накірунках. Практычна ўся сувенірная прадукцыя «Аквадзіва» вырабляецца толькі з сыравіны вышэйшай якасці. Але і так званая канвеерная прадукцыя таксама выпускаецца на аснове якаснай сыравіны.

Возьмем «Эліту» — гонар завода. Каб яна адпавядала строгім міжнародным стандартам і атрымала Гран-пры ў Сочы, трэба было як мінімум абавязкова мець спецыяльныя расы дражджэй і высакаякасную сыравіну — збожжа. А яно, між іншым, на завод не завозіцца з-за мяжы, а нарыхтоўваецца ў сваёй Мінскай вобласці.

Каб адпавядаць гэтай абавязваючай назве «Эліта», на заводзе пастаянна клапоцяцца аб павелічэнні аб'ёмаў нарыхтовак менавіта якаснага збожжа. Яго доля ў засеках завода няўхільна расце: сёлета пшаніцы і трыцікале нарыхтавалі на 64 працэнты больш у параўнанні з мінулым годам. Ці з 24 тысяч тон нарыхтаванай сыравіны 19,8 тысячы тон складае высакаякаснае збожжа. Праўда, яно абыходзіцца заводу даражэй, чым звычайнае, затое можна быць упэўненым у якасці канчатковага прадукту.

На заводзе, бадай, першымі ў краіне адрадзілі старадаўнюю традыцыю выкарыстання прарошчанага ячменю для атрымання натуральных ферментаў. Менавіта яны надаюць «Эліце» асаблівы мяккі смак і непаўторны густ. А значыць і той прадукцыі, якая потым з яго вырабляецца. Цяжка прыгадаць, дзе яшчэ ў краіне выкарыстоўваецца нізкатэмпературная тэхналогія разварвання збожжа на сыравіну. У выніку пры меншых энергазатратах яе атрымліваецца больш і лепшай якасці.

Мадэрнізацыя

Якасць прадукцыі таксама залежыць ад своечасовай замены старога абсталявання і ўкаранення новай тэхнікі.

Гэта толькі невялікая частка мноства дыпломаў і медалёў, якімі ўзнагароджана прадукцыя прадпрыемства.

Вада мінеральная «Аквадзіў».

Вада пітная негазаваная «Аквадзіў».

Аператар Марына АСІПОВІЧ.

Хутка на заводзе будзе змантіравана чарговая лінія па аўтаматычным разліве і ўпакоўцы гатовых вырабаў. Ужо сур'ёзна мадэрнізавана ёмістасная гаспадарка. Налета плануецца ўсталяванне яшчэ дзвюх дадатковых калон на брагарэктыфікацыйнай установе. Гэтыя калоны — ноу-хау ўкраінскіх спецыялістаў, іх апошняе слова ў распрацоўцы абсталявання для канчатковай ачысткі сыравіны. Прагон яе праз калоны дазволіць значна палепшыць дэгустацыйныя ўласцівасці і фізіка-хімічныя паказчыкі, павялічыць аб'ёмы выпуску. Між іншым, такія калоны, якія абыдуцца заводу прыкладна ў мільярд з нечым рублёў, будуць упершыню эксплуатавацца ў Беларусі.

Праведзена мадэрнізацыя цэха настояў на травах. У прыватнасці, замянілі старыя ёмістасці на сучасныя з нержавейкі. Такім чынам з'явіліся ўмовы для вытворчасці шырокага асартыменту настояў на травах, лікёраў. Закупілі абсталяванне для выпуску вырабаў з пахам лімона, апельсіна, аніса і іншых экзатычных пладоў і ягад.

Адзін з галоўных спецыялістаў завода Ірына Кісляк гаворыць, што на выпуск прадукцыі ідуць толькі натуральныя сокі без аніякіх дабавак. Сокі вырабляюцца непасрэдна на прадпрыемстве з беларускай сыравіны, якую набываюць у навакольных гаспадарках раёна і вобласці. Звярніце ўвагу, на «Аквадзіве» рашуча адмовіліся ад выкарыстання канцэнтраваных сокаў. Бо яны па сваіх характарыстыках не лепшы матэрыял для выпуску якаснай прадукцыі. Таму на заводзе навучыліся абыходзіцца толькі натуральнымі кампанентамі, без ужывання розных красіцеляў, дабавак, якія толькі ствараюць ілюзію смаку напою, які не заўсёды бяспечны для здароўя.

Пэўным крокам наперад у развіцці прадпрыемства стаў запуск у серыю бальзаму «Аквадзіў». У яго рэцэптуры 28 кампанентаў, з іх больш за 20 настояў розных беларускіх траў, што робіць напой духмяным і смачным. Зроблены па класічнай тэхналогіі, невыпадкова бальзам «Аквадзіў» карыстаецца вялікім попытам.

Жывая крынічная вада «Аквадзіў»

Слова «Аквадзіў» прыйшло ў Беларусь з Заходняй Еўропы ў сярэднявеччы. Яно мае лацінскія карані: «aqua» — вада, «divino» — натхненне. У старажытнай Беларусі аквадзіў яшчэ называлі «Вадой Дзівы». Аб карысных уласцівасцях гэтай воды хадзіла шмат паданняў і легенд.

На заводзе імкнуцца глядзець наперад. Там на ўласным вопыце ведаюць, што канкурэнтаздольны прадукт на пустым месцы не ўзнікае і выпадкова не атрымліваецца. Так, здараецца, што пашчасціць выпадкова зрабіць нешта ўдалае і запатрабаванае на рынку. Але звычайна новы і цікавы для спажыўца прадукт — вынік творчай і паўсядзённай працы. Напрыклад, у Малінаўшчызне правамерна ганарацца сваёй новай пітной вадой пад фірменнай назвай «Аквадзіў».

Аб тым, што вада — гэта вельмі сур'ёзна і ставіцца да яе ўжывання трэба адпаведна, у чарговы раз нядаўна нагадала ААН. Яна праз сваю структуру ФАО — Сусветную арганізацыю па харчаванні звярнулася да ўсіх жыхароў планеты з заклікам навучыцца лічыць кожную кроплю вады. Такая пазіцыя абумоўлена тым, што па папярэдніх разліках ААНаўскіх экспертаў, у 2025 годзе 1,8 млрд чалавек будуць мець няшчасце жыць у краінах і рэгіёнах з абсалютным дэфіцытам вады. А дзве трэціх насельніцтва Зямлі — ва ўмовах абмежаванага забеспячэння вадой. Надышоў час не ставіцца да вады, як да бясконцага і бясплатнага рэсурсу. Бо нават жыхары асобных раёнаў многіх краін (у тым ліку і нашай), дзе прэснай вады яшчэ нядаўна было дастаткова, пачынаюць ужо сутыкацца з яе недахопам.

На жаль, ужо нярэдка становіцца небяспечным піць ваду з калодзежа. У ёй спецыялісты ўсё часцей знаходзяць шкодныя для арганізма чалавека рэчывы. Згодна з вынікамі лабараторных даследаванняў Міністэрства аховы здароўя Беларусі, сёння далёка не ва ўсіх калодзежах іх вадкасць адпавядае ўстаноўленым нормам. Праблема ў тым, што ў вёсках і пасёлках няма каму грунтоўна і ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі займацца абслугоўваннем артэзіянскіх свідравін, калодзежаў. Там далёка не заўсёды халодная і свежая вада з'яўляецца якаснай. Многія калодзежы размешчаны не ў самых лепшых для атрымання чыстай вады месцах — каля дарог ці побач з гаспадарчымі пабудовамі, хлявамі для жывёлы і птушкі.

Усе гэтыя абставіны і навялі кіраўніцтва завода на думку аб выпуску для штодзённага ўжывання якаснай пітной вады. Ці, інакш кажучы, далучыцца да вырашэння такой важнай праблемы (зразумела, на сваім узроўні), як вадазабеспячэнне насельніцтва.

Выпуск новай прадукцыі — пітной без газаў вады «Аквадзіў» быў асвоены не адразу. Папярэднічала доўгая і карпатлівая работа. Тут вельмі дапамог вопыт вырабу мінеральнай лячэбна-сталовай вады «Аквадзіў», якая здабываецца з глыбокай свідравіны, размешчанай на тэрыторыі завода. Дарэчы, яна паказана пры наступных захворваннях: хранічныя гастрыты, хранічныя каліты і энтэракаліты; хранічныя захворванні печані і жоўцевывадных шляхоў (гепатыты, халецыстыты, жоўцекаменная хвароба), постхалецыстэкматычны сіндром, хранічныя панкрэатыты, хваробы абмену рэчываў (цукровы дыябет, атлусценне, падагра, мочакіслы дыятэз, аксалурыя) і інш. Нямала спажыўцоў мінеральной вады «Аквадзіў» у Злучаных Штатах Амерыкі і Азербайджане.

Цяпер вось пачалі выпуск і пітной вады. Яе адрозненне ад іншай такой прадукцыі ў тым, што вада ў Малінаўшчызне апрацоўваецца азонам на спецыяльна распрацаваным і зробленым сумесна з навукоўцамі Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук і яе Навукова-вытворчым цэнтрам па механізацыі сельскай гаспадаркі найноўшым, калі не сказаць больш — унікальным абсталяваннем.

Дарэчы, аналагаў гэтай установы няма ні ў аднаго беларускага прадпрыемства па выпуску мінеральнай і пітной вады. Цяпер жывая пітная вада «Аквадзіў» выпускаецца ў зручных 5-літровых ёмістасцях. У планах выпуск у 19-літровых ёмістасцях.

Спецыялісты завода перш чым зрабіць заказ мінскім навукоўцам вывучылі айчынны і замежны вопыт выкарыстання азону — прыроднага ачышчальніка з унікальнымі ўласцівасцямі. Прыйшлі да высновы, што апрацоўка вады азонам практычна не ўплывае на яе прыродныя вартасці, не пагаршае яе смак, але яе якасныя параметры значна павышаюцца.

